The Project is funded
by the European Union

EUROEAST CULTURE
RMCB Unit

*Неафіцыйны пераклад*

**Рэгіянальнае бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры (РБМІР)**

**Дагавор EuropeAid No 2010/255-219**

# АНАЛІТЫЧНАЯ БАЗАВАЯ СПРАВАЗДАЧА АБ КУЛЬТУРНЫМ СЕКТАРЫ І КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫЦЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Даследаванні і дыягностыка па культурнай палітыцы краін Усходняга партнёрства

Гэтая справаздача была падрыхтавана Рэгіянальным бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры:

*Спадар Тэры Сандэл, эксперт РБМІР*
*Спадарыня Вольга Кліп, эксперт РБМІР*
*Спадар Лучана Глур, кіраўнік РБМІР*
*Спадарыня Таццяна Білецкая, эксперт па развіццю патэнцыялу РБМІР*

2012

Гэтая справаздача была падрыхтавана пры падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Змест гэтай справаздачы з'яўляецца прадметам адказнасці Рэгіянальнага бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры. Яна адлюстроўвае меркаванне экспертаў і ніякім чынам не можа лічыцца адлюстраваннем поглядаў Еўрапейскай Камісіі.

Праект РБМІР рэалізуецца кансорцыумам на чале з Deutsche Gesellschaft für Internationale Zusammenarbeit (GIZ) GmbH у партнёрстве з HYDEA SpA (Італія) і RWTH Aachen University (Германія).

# Змест


Спіс скарачэнняў ... 3
Падзякі ... 4
Прадмова ... 5
1. Перадумовы да сітуацыі ў сферы культуры ў краінах Усходняга партнёрства ... 8
2. Некаторыя асноўныя характарыстыкі культуры і культурнага развіцця ў Беларусі ... 12
3. Даследчы агляд ... 14
3.1. Кантэкст / Умовы ... 14
3.1.1. Пытанні заканадаўства, падаткаабкладання, рэгістрацыі і працаўладкавання, якія ўплываюць на культуру. Ступень, у якой гэтыя меры аказваюць падтрымку развіццю культуры і творчасці. ... 14
3.1.2. Празрыстасць і карупцыя ... 16
3.1.3. Забеспячэнне і распаўсюд афіцыйнай і грамадскай інфармацыі ... 16
3.1.4. Інтэграцыя культурных праграм у іншыя праграмы і стратэгіі ... 17
3.1.5. Справаздачнасць і адкрытасць на практыцы ... 18
3.1.6. Унёсак у сферу культуры ... 18
3.1.7. Роля незалежнага сектара і НДА ... 19
3.1.8. Роля прыватнага і камерцыйнага сектара. ... 19
3.1.9. Нацыянальныя традыцыйныя і электронныя сродкі масавай інфармацыі, доля публікацый у сферы культуры і па праблемах культуры ... 20
3.1.10. Адрозненні паміж гарадской і сельскай мясцовасцю з пункту гледжання папулярызацыі культуры і доступу да культурнай сферы ... 21
3.1.11. Пытанні мовы ... 22
3.2. Стварэнне / вытворчасць і захаванне / рэстаўрацыя ... 23
3.2.1. Адносная значнасць, якая надаецца сучаснай культурнай творчасці згодна нацыянальным праграмам у сферы культуры і на практыцы (г.зн. фінансаванне) ... 23
3.2.2. Апісанне ўмоў ажыццяўлення розных відаў культурнай і мастацкай творчасці / вытворчасці ... 24
3.2.3. Творчасць ... 24
3.2.4. Культурная спадчына ... 24
3.2.5. Рэстаўрацыйныя рэсурсы і магутнасці ... 26
3.2.6. Канвенцыя ЮНЭСКА па абароне і папулярызацыі культурнай разнастайнасці ... 26
3.3. Папулярызацыя культуры/ Даследаванні/ Прафесійнае навучанне і пераемнасць/ Распаўсюд/ Сувязь/ Аблічбоўка ... 26
3.3.1. Агульныя ўмовы ... 26
3.3.2. Прафесійнае навучанне ... 27
3.3.3. Выкарыстанне інтэрнэту і забеспячэнне сувязі ... 27
3.3.4. Праекты ў сферы лічбавых тэхналогій ... 28
3.4. Доступ і адукацыя ... 29
3.4.1. Доступ ... 29
3.4.2. Адукацыя ... 29
3.5. Наведванні і пашырэнне аўдыторыі ... 30
3.5.1. Статыстыка наведванняў ... 30
3.5.2. Пашырэнне аўдыторыі ... 30
4. Асноўныя вынікі даследчага візіту РБМІР у краіну ... 31
Спісы крыніц ... 34
Бібліяграфія друкаваных/ вэб-публікацый па пытаннях культурнай палітыкі і культурнага сектара Беларусі ... 34
Web-pages ... 36
Дадатак 1. SWOT-ацэнка нацыянальнымі зацікаўленымі структурамі культурнай палітыкі і прыярытэтных патрэб культурнага сектара краін УП ... 37
Дадатак2. Вытокі - Беларусь у гістарычным кантэксце ... 38

## Спіс скарачэнняў

| | |
|---|---|
| **Ацэнка запатрабаванняў у 2008 г.** | Справаздача аб аказанні падтрымкі ІЕПД Усходняга рэгіянальнага супрацоўніцтва ў галіне культуры (нумар дагавора 2007/146264) Ацэнка запатрабаванняў, прадстаўленая ў ЕС у верасні 2008 г. |
| **Базавыя справаздачы** | аналітычныя базавыя справаздачы аб культурным сектары і культурнай палітыцы з шасці краін Усходняга партнёрства |
| **Беларусь** | Рэспубліка Беларусь |
| **Бел.руб.** | беларускі рубель (нацыянальная грашовая адзінка) |
| **УП** | Усходняе партнёрства |
| **Краіны УП** | Арменія, Азербайджан, Беларусь, Грузія, Малдова, Украіна |
| **Рэгіён УП** | Арменія, Азербайджан, Беларусь, Грузія, Малдова, Украіна |
| **ЕК** | Еўрапейская камісія |
| **ІЕПД** | інструмент еўрапейскай палітыкі добрасуседства |
| **ЕС** | Еўрапейскі саюз |
| **Дзяржавы-члены** | дзяржавы-члены Еўрапейскага Саюза |
| **МК** | Міністэрства культуры (адказнае за пытанні культуры) |
| **Рэгіянальная даслледчая справаздача** | рэгіянальная даслледчая справаздача аб палітыцы ў галіне культуры і тэндэнцыях у краінах Усходняга партнёрства |
| **Праграма** | праграма Усходняга партнёрства па пытаннях культуры |
| **Праект** | праект Рэгіянальнага бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры |
| **Практыкум** | павышэнне кампетэнтнасці/ фармат інтэрактыўнага навучання і аналізу рэальных прыкладаў/ групавая работа, звязаная з праектам |
| **РБМІР** | Рэгіянальнае бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры |
| **Семінар** | развіццё патэнцыялу/ фармат трэнінгу на аснове лекцый/ прэзентацыі |
| **SWOT** | аналіз моцных і слабых бакоў, магчымасцяў і пагроз |
| **ТД** | тэхнічная дапамога |

## Падзякі

Рэгіянальнае бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры выказвае сваю ўдзячнасць дэлегацыі ЕС у Беларусі і, у прыватнасці, спадару Лэвеліну Эдвардсу, кіраўніку аператыўнага аддзела, за актыўны ўдзел у круглым стале і Вячаславу Шэлегейку, кіраўніку праекта, за яго эфектыўную падтрымку ў падрыхтоўцы гэтага мерапрыемства і ўсяго даследчага візіту, які распачаў працэс дыягностыкі і даследаванняў. Бюро РМІР таксама выказвае падзяку Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь і асабіста спадару Міхаілу Кажура, кіраўніку аддзела міжнародных сувязяў, за дапамогу ў арганізацыі круглага стала і падтрымку ў зборы інфармацыі для гэтай справаздачы.

Нарэшце, бюро РМІР выказвае сваю ўдзячнасць усім прадстаўнікам асноўных нацыянальных зацікаўленых структур па Культурнай праграме Усходняга партнёрства: органам дзяржаўнай улады і, у прыватнасці, Міністэрству культуры, прадстаўнікам прыватнага сектара, прафесійным асацыяцыям і грамадзянскай супольнасці, а таксама незалежным дзеячам культуры і донарскім арганізацыям, якія дзейнічаюць у краіне, за іх неацэнны ўклад у падрыхтоўку гэтай справаздачы:

Аляксандру Адамянтс, Аляксею Андрэеву, Вользе Архіпавай, Таццяне Арцімовіч, Ігару Аўдзееву, Франку Бауману, Аляксандру Багданаву, Марыне Барысавай, Ганне Чыстасердавай, Марыне Дашук, Уладзіміру Дзянісаву, Вользе Дзмітрыевай, Крысціяне Янэке, Дзмітрыю Карэнку, Андрэю Хадановічу, Наталлі Хвір, Валянціне Кісялёвай, Пятру Казакевічу, Севярыну Квяткоўскаму, Ігару Логвінаву, Юрыю Мацюну, Дар'і Мацявінай, Вользе Міранчук, Наталлі Нагібінай, Уладзіміру Парфянку, Віктару Пятрову, Таццяне Пашэвалавай, Раману Рамановічу, Святлане Русанавай, Вользе Рыбчынскай, Сяргею Сахараву, Сяргею Шабохіну, Івану Шчадранку, Алісіі Шыбіцкай, Аляксею Шынкарэнку, Марыне Шукуравай, Андрэю Скурко, Але Сташкевіч, Ягору Сурскаму, Таццяне Вадалажскай, Алене Здобнікавай і многім іншым.

## Прадмова

Змест гэтага дакладу з'яўляецца прадметам адказнасці Рэгіянальнага бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры і адлюстроўвае меркаванні экспертаў праграмы. Дадзеная справаздача не з'яўляецца адлюстраваннем меркаванняў Еўрапейскай Камісіі.

Дадзеная справаздача прызначана для шырокага кола чытачоў, уключаючы ўсе зацікаўленыя бакі ў культурным сектары краін Усходняга партнёрства і дзяржаў-членаў Еўрапейскага Саюза. Справаздача з'яўляецца вынікам *Даследаванняў і дыягностыкі па культурнай палітыцы ў краінах Усходняга партнёрства,* якія ажыццяўляюцца Рэгіянальным бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры з кастрычніка 2011 г. па сакавік 2012 г. Даследаванні датычаць палітыкі ў галіне культуры ўсіх шасці краін Усходняга партнёрства - Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны і практычна арыентаваны на забеспячэнне стратэгічнага кіравання ўсей праграмай Усходняга партнёрства па пытаннях культуры і дзейнасці Рэгіянальнага бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця (РБМІР).

Вынікі даследавання былі прадстаўлены ў выглядзе «усебаковай справаздачы», якая ўключае:

- Шэсць *Аналітычных базавых справаздач па сектару культуры і культурнай палітыкі* (базавыя справаздачы) па кожнай краіне-партнёру;
- *Рэгіянальную даследчую справаздачу па культурнай палітыцы і тэндэнцыях развіцця краін Усходняга партнёрства* (Рэгіянальная даследчая справаздача), якая ахоплівае ўсе краіны УП і вызначае прыярытэтныя напрамкі дзеля ўдасканалення ў галіне культуры краін-партнёраў на перыяд да сакавіка 2015 года.

Аналізуючы ў часавым вымярэнні стан культуры ў дзяржаўным і прыватным сектарах кожнай краіны, базавыя справаздачы будуць спрыяць паказу прагрэсу ў культурным сектары кожнай з краін і праграме Усходняга партнёрства па пытаннях культуры ў цэлым. Гэтыя справаздачы грунтуюцца галоўным чынам на канцэптуальным параўнальным аналізе палітыкі канкрэтнай краіны ў дачыненні да існуючых міжнародных стандартаў, якія РБМІР распрацавала ў супрацоўніцтве з шасцю мясцовымі экспертамі пад кіраўніцтвам міжнароднага эксперта. У ходзе рэалізацыі праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры мы будзем выкарыстоўваць тыя ж паказчыкі для далейшай ацэнкі ўзроўню развіцця і зменаў, якія дасягнуты ў сферы культуры. Мы спадзяемся, што гэтыя паказчыкі і справаздачы па краінах будуць мець значэнне і для ўлады краін Усходняга партнёрства ў якасці інструмента для ацэнкі змяненняў у стане сваіх нацыянальных культурных сфер.

Шэсць базавых справаздач былі перададзены нацыянальным уладам і іншым зацікаўленым бакам краін УП на стадыі праекта і асноўныя высновы Рэгіянальнага дакладу былі прадстаўлены ў Брусэлі ў верасні 2012 года на Семінары Экспертаў па Культурнай палітыцы Усходняга партнёрства (Платформа 4) і на Першай рэгіянальнай канферэнцыі праграмы Усходняга Партнёрства культуры ў Тбілісі, Грузія, ў кастрычніку 2012 года. Нацыянальныя органы ўлады былі запрошаны пракаментаваць або пасадзейнічаць з дадатковай інфармацыяй. Некаторыя з базавых справаздач былі абноўлены на аснове інфармацыі, прадстаўленай нацыянальнымі уладамі ў верасні - лістападзе 2012 года.

Шэсць базавых справаздач на англійскай мове і нацыянальных мовах і Рэгіянальная даследчая справаздача на англійскай і рускай мовах апублікаваны ў электронным выглядзе на вэб-сайце Праграмы (www.euroeastculture.eu) разам з унескамі нацыянальных органаў улады, звернутымі да РБМІР. Усе зацікаўленым ў галіне культуры прапануецца выкарыстоўваць вэб-сайт Праграмы ў якасці платформы для дыялогу і ўносіць свой уклад у форме водгукаў і каментарыяў да справаздач.

Было адзначана, што традыцыйныя культурныя класіфікацыі сектара, напрыклад, на суб-сектары, не з'яўляецца прыдатным для праграмы УП, накіраванае на выяўленне практычных вынікаў. Гэтыя вынікі будуць звязаны з іх укладам у такія галіны, як дэмакратызацыя, мадэрнізацыя і рэформы ў

краінах Усходняга партнёрства, а не ў адносінах да культуры / мастацтва, даследаванне сканцэнтравала сваю ўвагу на наступных пяці галінах:

- Умовы для культурных  ініцыятыў у кожнай з краін;
- Творчасць і вытворчасць;
- Забеспячэнне, перадача і распаўсюджванне культуры;
- Пытанні, звязаныя з доступам да культуры;
- Удзел у культурным жыцці.

У гэтай класіфікацыі меліся на ўвазе і ўскосныя пытанні: дэмакратызацыя і мадэрнізацыя, у якой ступені клімат спрыяльны для культуры і культурнай вытворчасці; ступень «адкрытасці» у сістэме культуры; адносная здольнасць краін атрымліваць прыбытак з рэвалюцыйных распрацовак, якія істотна ўплываюць на культуру, у тым ліку аблічбоўка, інтэрнэт і змены ў тым, як культура «спажываецца»; як вытворцы і спажыўцы культуры ставяцца адзін да аднаго ўнутры сістэмы; і, нарэшце, якія патрэбы могуць узнікнуць у сувязі з развіццём, стварэннем патэнцыялу і падрыхтоўкай кадраў.

Больш падрабязную інфармацыю пра становішча рэгіянальнай палітыкі Еўрапейскай Камісіі і пра бягучыя тэндэнцыі ў краінах-удзельніцах, якія маюць дачыненне да праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры, а таксама пра аналітычныя крытэрыі, якія прымяняюцца ў даследаваннях, пра крыніцы вызначэння еўрапейскіх і міжнародных стандартаў, звязаныя з культурнай палітыкай і пра метадалогію, якая прымяняецца для вызначэння асноўных элементаў і рабочых працэдур даследавання, можна знайсці ў Рэгіянальнай даследчай справаздачы.

Даследаванні грунтуюцца на базе шасці навукова-даследчых візітаў Рэгіянальнага бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця ў краіны Усходняга партнёрства ў лістападзе - снежні 2011 года. Вынікі візіту ў Беларусь прадстаўлены ў раздзеле 4-м гэтай справаздачы. Неабходна адзначыць, што ў той час як *Даследчы агляд* (раздзел 3) дае аналіз сітуацыі ў галіне культуры на нацыянальным узроўні і ў рамках больш шырокага рэгіянальнага кантэксту УП і заснаваны на параўнанні з міжнароднымі стандартамі і крытэрыямі, то аналітычнае рэзюмэ РБМІР па *Асноўных выніках даследчага візіту ў краіну* (раздзел 4) і асабліва *SWOT-ацэнка нацыянальнымі зацікаўленымі структурамі культурнай палітыкі і прыярытэтных патрэб культурнага сектара краін УП* (Дадатак 1), адлюстроўваюць бачанне шырокага кола нацыянальных структур, зацікаўленых у Праграме.

Паколькі колькасць рэспандэнтаў, якія ўнеслі свой уклад у SWOT-ацэнка нацыянальнымі зацікаўленымі структурамі культурнай палітыкі і прыярытэтных патрэб культурнага сектара краін УП была недастатковай, каб служыць навукова надзейнай асновай для аналітычнага даследавання, у выніку SWOT адзнака была прыкладзеная да дакладу толькі з інфармацыйных мэтаў. Варта ўсё ж адзначыць, што SWOT ацэнкі вынікаў адпавядаюць высновам аналізу.

Раздзел 3: *Даследчы раздзел* справаздач па краінах прызначаны для абагульнення высноў , абапіраючыся на фактычныя дадзеныя і апублікаваныя крыніцы. На пытанні, прадугледжаныя ў апытальніках, не заўсёды даваліся паўнавартасныя адказы, тым не менш, мы вырашылі захаваць адпаведныя раздзелы справаздачы аб праведзеным даследаванні нязменнымі, каб захаваць адпаведнасць прапанаваным крытэрыям ацэнкі. Дзе дадзеных і доказаў не хапае, як правіла, у справаздачы пазначана: *«Няма дадзеных / інфармацыя не знойдзена»*, часам нават было неабходна сфармуляваць меркаванні. Колькасць такіх выпадкаў была зведзена да мінімума.  . У некаторых іншых выпадках, калі інфармацыя  не магла быць знойдзена  ў адведзены час , у справаздачы гаворыцца: *«Няма дадзеных / інфармацыя не сабрана».* Спадзяемся, што больш поўная інфармацыя для ацэнкі культурнага сектара будзе лягчэй даступная ў будучым.

Гэтае даследаванне ўзначальваў спадар Лучана Глур, кіраўнік РБМІР, і спадарыня Таццяна Білецкая, эксперт па развіццю патэнцыялу РБМІР. Спадарыня Т. Білецкая таксама была адказнай за ўсе этапы практычнай рэалізацыі даследаванняў і дыягностыкі, уключаючы збор і аналіз вынікаў даследавання, візіты ў краіны-партнёры і канчатковае складанне і рэдагаванне сямі справаздач.

Спадар Тэры Сандэл, эксперт РБМІР, забяспечыў метадычнае кіраўніцтва даследаваннямі, уключаючы распрацоўку крытэрыяў аналізу стану культурнага сектара ў краінах-удзельніцах, аналітычных катэгорый і паказчыкаў, а таксама структураванне аналітычных даследаванняў, заснаваных на справаздачах краін, інструкцый для іншых экспертаў і складанне або рэдагаванне раздзелаў 1-3 і Дадатак 2 справаздач па краінах.

Спадарыня Вольга Кліп, эксперт РБМІР, была адказнай за падрыхтоўку аналітычна- даследчага агляду, прадстаўленага ў раздзеле 3, а таксама за збор тэкставых і статыстычных дадзеных і правядзенне параўнальнага аналізу крытэрыяў і стандартаў.

Для атрымання дадатковай інфармацыі па гэтай справаздачы, яе метадалогіі і праведзеным работам можна звязацца са спадарыняй Таццянай Білецкай, экспертам па развіццю патэнцыялу РБМІР па адрасе: tetiana.biletska@euroeastculture.eu, а таксама спадаром Лучана Глур, кіраўніком групы РБМІР, па адрасе: luciano.gloor@euroeastculture.eu

# 1. Перадумовы да сітуацыі ў сферы культуры ў краінах Усходняга партнёрства

Спецыяльная рэгіянальная справаздача ў дадатак да гэтай справаздачы па краіне разглядае асобныя краіны ў агульным кантэксце і засяроджваецца на больш шырокіх тэндэнцыях і пытаннях, характэрных для ўсяго рэгіёну Усходняга партнёрства. Яна будзе тым не менш мэтазгодная, каб дапамгчы разабрацца ў тым, на  што былі накіраваныя даследаванні па Беларусі і які падыход быў прыняты дзеля гэтага.

З моманту набыцця незалежнасці шасці краінам Усходняга партнёрства давялося сутыкнуцца з вялізнымі цяжкасцямі і праблемамі. Як і ў многіх еўрапейскіх краінах, нягледзячы на тое, што культура разглядаецца як важная сфера, палітычныя рэаліі часта азначаюць, што яна не з'яўляецца прыярытэтам для фінансавання. Для Беларусі і іншых краін гэта часцей за ўсё азначае, што ў галіне культуры хутчэй вядзецца адчайная, рэактыўная барацьба за выжыванне, чым ствараюцца перспектыўныя планы. Адзіным магчымым курсам развіцця выбіраецца: трымацца за мінулае, захоўваючы тое, што можна, робячы спробы прымусіць сістэмы і працэсы працаваць, таму што гэта ўсе, што ёсць у наяўнасці (і таксама ўсе, з чым знаёмы); можна проста пайсці на кампраміс у надзеі, што аднойчы ўсе будзе лепш. Не было пытання аб «лепшым у параўнанні з добрым», а хутчэй аб «пасрэдным, якое па крайняй меры, лепш за дрэннае». Статус-кво было менш небяспечным, чым невядомасць.

Станаўленне культуры і культурнае развіццё не адбываюцца ў вакууме, і навакольнае асяроддзе ва ўсіх краінах Усходняга партнёрства, незалежна ад эканамічных і фінансавых аспектаў, якія згадваліся вышэй, у цэлым не спрыяе пазітыўнаму развіццю і зменам. Успадкаваныя палітычныя праблемы і задачы, якія непасрэдна ўплываюць на культуру, такія як спадчына савецкай лінгвістычнай, дэмаграфічнай, тэрытарыяльнай і этнічнай палітыкі, стварылі велізарныя скажэнні і перашкоды на шляху мірнага, устойлівага развіцця ў галіне культуры. Разнастайнасць, напрыклад, з'яўляецца надзвычай важным фактарам, які неабходна ў поўнай меры ўлічваць, прынамсі, у пяці з шасці краін пры распрацоўцы культурнай палітыкі. Разнастайнасць цалкам можа быць культурным дабраславеннем, але пры пэўных абставінах яна можа быць, на жаль, палітычным праклёнам. Канфлікт, напружанасць, адсутнасць даверу, інтрыгі і несправядлівасці гісторыі замарудзілі і моцна ўскладнілі пазітыўныя змены ў гэтых краінах.

Да таго ж, было мноства іншых праблем ва ўсіх краінах, у тым ліку слабая інстытуцыянальная інфраструктура, карупцыя, якая атручвае грамадства і яго каштоўнасці, нестабільнасць, а часам нават страта ўпэўненасці ў заўтрашнім дні. На гэтым фоне быць Міністрам культуры ці старшынёй парламенцкага камітэта па культуры і спадчыне, або дарадцам Прэзідэнта па культуры, было, напэўна, такім жа хвалюючым, як быць мастаком-змагаром, музейным куратарам або бібліятэкарам.

Аднак, у апошні час, у культуры, культурнай палітыцы і культурным развіцці рэгіёна пачынаюць з'яўляцца некаторыя прыкметы аднаўлення і росту, заднім розумам можна ўбачыць, што на самой справе прагрэс быў дасягнуты, хоць і невялікі, і не так хутка, як усім хацелася, асабліва ў Беларусі, дзе схільнасць краіны да кансерватызму і палітычная ізаляцыя стварылі дадатковыя перашкоды.

Нягледзячы на тое, што Беларусь пакуль не вырашыла ці варта пачаць рух у кірунку міжнародных стандартаў, якія адпавядаюць яе новай дзяржаўнасці, беларуская моладзь і, у прыватнасці, кваліфікаваныя спецыялісты пачынаюць усведамляць перавагі мадэрнізацыі: новыя захапляльныя магчымасці, якія адкрываюцца ў сувязі з лічбавай рэвалюцыяй, якая разгортваецца ў цяперашні час, інтэрнацыяналізмам і глабалізацыяй, адкрыццём мноства ідэнтычнасцяў і магчымасцяў асабістай самарэалізацыі, - а таксама ролю і ўклад культуры і творчасці, у іх сучасным вызначэнні, у сацыяльныя, эканамічныя і гуманітарныя праграмы і нацыянальнае, рэгіянальнае і індывідуальнае развіццё.

Удзел у праграме Усходняга партнёрства па пытаннях культуры настолькі ж важны, як практыка навучання, і настолькі патэнцыйна карысны для Еўрапейскага саюза і яго дзяржаў-членаў, як і для Беларусі. Гэта ўзаемадзеянне з'яўляецца асабліва своечасовым, таму што Беларусь перажывае важны перыяд культурнай дыскусіі і ў ёй адбываюцца павольныя, але рэальныя глыбінныя змены,

звязаныя з нацыянальнымі спадзяваннямі і кірункам, у якім краіна жадае развівацца. Можна сцвярджаць, што гэты працэс пазнання і разумення свайго гістарычнага і савецкага мінулага, абмеркавання і выпрацоўкі бачання сваёй беларускай тоеснасці і развіцця адпаведнай еўрапейскай будучыні, лепш за ўсё рабіць у больш шырокім кантэксце, прапанаваным праграмай Усходняга партнёрства па пытаннях культуры і іншымі падобнымі праграмамі.

Сучасная культурная сцэна Беларусі даволі жывая, са сваімі станоўчымі падзеямі, якія часта незаўважна праходзяць для замежжа, бо палітычныя аспекты культуры, у тым ліку цэнзура і іншыя рэпрэсіўныя меры, як правіла, толькі і дасягаюць заходніх СМІ. Музычная сцэна такая ж цікавая, як і ўсюды, у той час менш развітыя галіны, такія як сучаснае выяўленчае мастацтва, праходзяць важны шлях станаўлення. Адносна апошняга павінна быць адзначана паспяховае функцыянаванне першай рэальна незалежнай/прыватнай галерэі, якая становіцца цэнтрам для больш шырокага мастацкага абмену і дзейнасці, сродкам прыцягнення грамадскасці да сучаснага мастацтва. Тое ж самае датычыць такіх галін, як фатаграфія, незалежная выдавецкая дзейнасць і крытычная культурная журналістыка. Беларуская літаратура і тэатр, магчыма з-за цэнзуры або, нягледзячы на яе, да гэтага часу адыгрываюць важную ролю, як было і ў савецкія часы. Падзел паміж «дзяржаўным» мастацтвам і незалежнымі мастацтвамі з'яўляецца значным і істотным, але цікава адзначыць, што праблема старых «творчых саюзаў» у былых савецкіх краінах, у некаторых рэгіёнах Рэспублікі Беларусь вырашаецца праз з'яўленне новых «саюзаў» з высокай ступенню даверу, адным з прыкладаў таму з'яўляецца незалежны Саюз пісьменнікаў.

Улічваючы прыроду чалавека, стрымліванне непазбежна прыводзіць да вынаходства, і тут няма лепшага прыкладу, чым выкарыстанне інтэрнэту ў Беларусі, асабліва ў Мінску. Якасць і эфектыўнасць некаторых вэб-сайтаў, звязаных з культурай, прама ці ўскосна здзіўляе, а яго выкарыстанне ў якасці інструмента для абмеркавання, сацыяльнага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва з'яўляецца дастаткова дасканалым і перадавым.

На гэтым фоне клімат для рэальнага культурнага развіцця не выглядае спрыяльным. Над публікацыямі па пытаннях культуры часта вісіць непрадказальны дамоклаў меч – гэта і ўмяшальніцтва цэнзуры, і непасрэднае закрыццё выданняў. Бязлітасны закон, які абмяжоўвае права на свабоду сходаў, тэхнічна робіць незаконным любое спантаннае самавыяўленне мастака, або чытанне неафіцыйнай публічнай лекцыі акадэмікам перад аўдыторыяй, якой бы малой яна не была. Рэгістрацыя і падатковыя правілы такія, што адказныя людзі ў канчатковым выніку працуюць незаконна, таму што яны не могуць зарэгістравацца, ці таму, што проста немагчыма дзейнічаць у адпаведнасці з правіламі. Вядомы факт, што беларускі Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, які святкуе сваё дваццацігоддзе, быў вымушаны пераехаць з Мінска ў Вільню ў 2004 годзе, не мае патрэбы ў каментарах.

Але прафесіяналізм большасці беларускіх культурных дзеячаў, часта пераадольваючы неспрыяльнае палітычнае і адміністрацыйнае асяроддзе, усё ж становіцца крыніцай пазітыўных перамен, часам нават і ў дзяржаўным сектары. Апошняя мадэрнізацыя вэб-сайта беларускага Міністэрства культуры, які цяпер даступны як на беларускай, так і на рускай мовах, і спроба перадаць праз яго значна больш інфармацыі, чым у мінулым, з'яўляецца прыкладам гэтага.

Такая сітуацыя дае дакладнае ўяўленне і пра тое, чаго нашае даследаванне спрабуе дасягнуць, а таксама і пра існуючы падыход. Прыкметы аднаўлення (зялёныя парасткі), культывацыя, насаджэнне ідэй, пасеў насення - гэта больш, чым проста метафары садаводства, якія мы ўжываем, гаворачы пра культуру і культурнае развіццё. На самай справе, тэрміналогіі культуры і садаводства лёгка і непасрэдна ператвараюцца з адной у другую і наадварот: «культуры» і «культуры», разнастайнасць (бія / культурная), «клімат», арганічны рост, «урадлівая глеба», «перакрыжаванае апладненне» (узаемнае ўзбагачэнне), нават, адважымся ўключыць і «абразанне». Даследчы агляд выкарыстоўвае метафару садаводства, каб паспрабаваць прааналізаваць тое асяроддзе краін і рэгіёнаў уцэлым, у якім культура сілкуецца і ўзрошчваецца. Ён накіраваны на выяўленне агульных базавых фактараў, якія абумоўліваюць замаруджванне культурнага развіцця і якія звязаны не толькі з фінансаваннем, якое заўсёды будзе праблемай.

Заўсёды магчыма правесці істотнае рэфармаванне, калі існуе палітычнае асяроддзе, якое дазваляе гэта зрабіць; яно не заўсёды залежыць ад бюджэту, але часцей залежыць ад кампетэнтнасці

кіраўніцтва, дасканаласці сістэмы кіравання, наяўнасці пошуку свежых падыходаў. Прыкладам таму з'яўляюцца некаторыя аспекты мадэрнізацыі ў такіх галінах, як музеі і бібліятэкі, якія аказваюць паслугі, арыентаваныя на кліентаў; клопат пра кліента з боку персаналу можа быць настолькі ж істотным, як і пытанні бюджэту.

Нельга чакаць ад любой дзяржавы – маладой, сталай, ці ад «падлеткаў» Усходняга партнёрства, якія знаходзяцца яшчэ ў раннім перыядзе сваёй незалежнасці, ні ад старых і новых членаў ЕС, якія знаходзяцца ў перыядзе эканамічнага і фінансавага крызізу, каб яны гарантавалі пастаяннае павелічэнне фінансавання на культуру, ні каб яны падтрымлівалі кожнага мастака і ўсе вартасныя культурныя ініцыятывы, ні нават каб яны цалкам разумелі творчасць і культурную спецыфіку іх грамадстваў. Чаго, аднак, можна чакаць ад усіх дзяржаў, якія цэняць еўрапейскія стандарты або ідэнтычнасць (і гэта напрамак даследаванняў і нашы спадзяванні ў будучым), гэта тое, што, як добры селянін 19 стагоддзя, - французскі, нямецкі, беларускі або любы іншы - яны ўсё яшчэ ведаюць, як вырошчваць расліны. Што датычыцца культуры і культурнага развіцця, яны ведаюць, як улічваць клімат, прыняць меры ў сувязі з надвор'ем, каб даглядаць, але не ўмешвацца без неабходнасці, як мець справу з «пустазеллем», калі яно сапраўды пагражае задушыць у цэлым здаровы рост і асобныя расліны. Можна абгрунтавана чакаць, што яны метафарычна паліваюць сад, выкарыстоўваючы найлепшым чынам дождж, і таксама прадугледжваюць меры на перыяд засухі. Апошняе, але не менш важнае, – яны павінны надаваць рэальную ўвагу пытанню пра доступ да культуры, пры ўмове, што дзяржаўны, незалежны і прыватны сектары дапамагаюць усім увайсці і атрымаць задавальненне ад «саду», пры гэтым дзяржавай прадугледжаны ўмовы для з'яўлення здаровага незалежнага і прыватнага сектараў.

Незалежна ад таго, багатая яна ці бедная, вялікая або маленькая, задача дзяржавы быць «садаводам» і «пасярэднікам» культуры. Такі падыход ствара значна больш роўнае «гульнявое поле», дзе рэальныя дасягненні могуць быць параўнаны па ўсёй Еўропе, яны не будуць залежаць выключна ад ВУП або аб'ёму сродкаў, выдзеленых на культурныя бюджэты. Адносна дзяржаўнага сектара, гэта можа быць выразна сфармуляваная задача: як мець Міністэрствы *для* культуры, а не традыцыйныя Міністэрствы культуры.

Даследчы агляд і звязаная з ім работа накіраваны таксама на выяўленне запатрабаванняў, галоўным чынам сярод тых, хто можа быць асабліва зацікаўленымі ў развіцці праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры і работы Рэгіянальнага бюро маніторынгу і інстытуцыйнага развіцця.

Некаторыя тэмы і запатрабаванні выяўляюцца ў выніку даследаванняў, у тым ліку:

(I) Выяўленне тых асоб, груп і арганізацый, якія могуць узрасціць «зялёныя парасткі», а таксама шляхоў іх найлепшай падтрымкі;

(II) Вызначэнне тыпу кіраўніцтва, які будзе неабходны на ўсіх узроўнях у сферы культуры;

(III) Выдзяленне ключавых элементаў, неабходных для культурнай палітыкі і культурных стратэгій, якія будуць спрыяць мадэрнізацыі і дазволяць культуры, культурнай палітыцы і культурнай дзейнасці дынамічна садзейнічаць развіццю чалавечага патэнцыялу, сацыяльнаму і эканамічнаму развіццю;

(IV) Спрашчэнне доступу да культуры, пераадоленне раздзяляльных межаў, такіх, як раздзяленне паміж вёскай і горадам, пранікненне культуры ў сучасныя каштоўнасці і свядомасць, асабліва моладзі;

(V) Балансаванне падтрымкі, накіраванай на захаванне мінулага з падтрымкай творчасці, арыентаванай у будучыню;

(VI) Прызнанне патэнцыялу і рэвалюцыйнага ўздзеяння камунікацый і новых тэхналогій у плане доступу, культурнага спажывання, культурнай ідэнтычнасці і асабістай самарэалізацыі;

(VII) Прыняцце да ўвагі і максімізацыя сінэргіі паміж культурнымі іграками на дзяржаўным, рэгіянальным, муніцыпальным, мясцовым, прыватным і незалежным / НДА узроўнях, на практычным і палітычным узроўнях; такім чынам, каб усе наяўныя рэсурсы, звязаныя з культурай, маглі быць эфектыўна выкарыстаны;

(VIII) Абмен станоўчым вопытам і ведамі ў разнастайным і пераменлівым свеце, дзе інструментарый хутка змяняецца карэнным чынам, у той час як людзі, магчыма, не так хутка мяняюцца з пункту гледжання іх памкненняў, абмежаванняў і страхаў.

Частка даследаванняў ажыццяўлялася як спроба параўнаць вопыт розных краін у яго пазітыўным і нейтральным варыянце, каб не ўдзельнічаць у «конкурсе прыгажосці». Даследчы агляд прызначаны для таго, каб скласці дакладнае ўяўленне пра стан культуры, і выступае ў якасці хуткага «медыцынскага агляду» шасці краін. Даследуюцца іх падыходы да культуры, культурнай палітыкі і культурнага развіцця, а таксама вызначэння, якімі могуць стаць будучыя запатрабаванні, аб'ектыўна і суб'ектыўна ацэненыя. На падставе вынікаў дасдедавання можна спадзявацца, што ў будучым можа развівацца больш значнае і прадуктыўнае супрацоўніцтва паміж ЕС, яго дзяржавамі-членамі і краінамі Усходняга партнёрства.

## 2. Некаторыя асноўныя характарыстыкі культуры і культурнага развіцця ў Беларусі

На працягу значнага перыяду пасля атрымання незалежнасці Беларусь прытрымлівалася прыярытэтаў, якія свядома адрозніваліся ад іншых краін Усходняга партнёрства. Аднак, як і для іх, асноўнай задачай у сферы культуры пасля абвяшчэння незалежнасці было простае выжыванне, малая ўвага да спадчыны, як часткі дзяржаўнай палітыкі па з'яднанню нацыі, фармаванню нацыянальнай самасвядомасці і захаванню інфраструктуры нацыянальных інстытутаў, атрыманых у спадчыну ад савецкага перыяду. У выпадку Беларусі, асабліва ў перыяд Лукашэнкі, пошук эканамічнай стабільнасці і захаванне атрыманых у спадчыну савецкіх інстытутаў былі прыярытэтнай палітыкай. Пэўныя змены ў галіне культуры, тым не менш, адбываліся.

Палітычныя фактары адыгрывалі важную ролю ў сферы культурнай палітыкі і культурнага развіцця ва ўсіх краінах Усходняга партнёрства, а ў Беларусі гэта было асабліва актуальна, таму што галіна культуры час ад часу з'яўлялася пляцоўкай, дзе абмяркоўваліся палітычныя погляды адносна будучыні краіны.

Нягледзячы на тое, што Беларусь у асноўным характарызуюць як прастору палітычнага кантролю і цэнзуры, якія асабліва моцна ўплываюць на культурны сектар, і з'яўляюцца пераважным іміджам краіны для староннiх назіральнікаў, на самой справе гэта толькі частка, хоць і вельмі істотная, агульнай карціны культурнага развіцця. Нават там, дзе палітычны кантроль і цэнзура прывялі да сур'ёзных страт, гэта прывяло часам да трансфармацыі, але не да поўнай ліквідацыі. Як паказвае вопыт іншых краін, пад рэпрэсіўнай уладай мастацтва і культура парадаксальна часам набываюць асаблівую значнасць, якую яны не заўсёды маюць пры дэмакратыі.

Ёсць некалькі цікавых парадоксаў у палітычным кантролі і цэнзуры ў Беларусі. Адным з іх з'яўляецца выпадак Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, які быў заснаваны ў 1992 годзе ў Мінску, але зачынены ўрадам у 2004 годзе. У выніку ён пераехаў у Вільню, дзе застаецца квітнеючай беларускай навучальнай ўстановай, якая мае статус літоўскага ўніверсітэта з колькасцю студэнтаў каля 1 800. Блізасць Вільні да Мінска азначае, што беларускі прафесарска-выкладчыцкі склад і студэнты рэгулярна перамяшчаюцца паміж двума гарадамі, у дадатак да тых беларусаў, якія перабраліся ў Літву для навучання або працы ва ўніверсітэце. Умяшальніцтва ў гэты рух людзей або ідэй дзеля навучання амаль што не адбываецца, а ўлічваючы спецыялізацыю ўніверсітэта, ён мае асабліва важны ўплыў на культурнае жыццё ў Беларусі, у тым ліку ў плане развіцця самастойнага мыслення, звязанага з культурнай палітыкай.

Аналагічным чынам абмежаванне свабоды сходаў у Беларусі, якое ўплывае на ўсе віды грамадскіх сходаў, у тым ліку на правядзенне канцэртаў і іншых культурных мерапрыемстваў, вымусілі людзей, асабліва моладзь, максімальна эфектыўна карыстацца інтэрнэтам. Нягледзячы на меры па арганізацыі ў Беларусі кантролю над інтэрнэтам, ён з'яўляецца ў значнай ступені бесцэнзурнай і асабліва жывой прасторай, з некаторымі сапраўды выдатнымі мясцовымі вэб-сайтамі, прысвечанымі грамадскай дзейнасці і культуры. Увогуле, вялікая колькасць бар'ераў, якія выстаўляюцца ўладамі ў штодзённым жыцці, вынаходліва абыходзіцца пры дапамозе шырокага і творчага выкарыстання віртуальнай прасторы.

Сфера сучаснай музыкі з'яўляецца адной з тых, праз якую можна прасачыць бягучыя падзеі, дзе палітыка ўраду ў чарговы раз прывяла да цікавых трансфармацый, але не да ліквідацыі. Дзяржаўная культурная палітыка кантролю і чорных спісаў прывяла да таго, што пэўныя музыкі карыстаюцца, часам не па сваёй волі, як палітычнай, так і мастацкай папулярнасцю, выкарыстоўваючы першую і актыўна падтрымліваючы другую. Хоць было б няправільна лічыць, што ўсе мастакі і пісьменнікі належаць да аб'яднанай апазіцыі – бо рэальнасць у тым, што яны, як правіла, знаходзяцца ў шырокім прасторавым дыяпазоне: ад маўклівай згоды да ўпартай барацьбы з рэжымам. Але кантроль, цэнзура і рэпрэсіўныя меры з боку ўладаў ствараюць умовы, калі большасць з іх, а не толькі тыя, што знаходзяцца на крайнім канцы спектра, трапляюць у праблемныя сітуацыі, у якіх яны атаясамляюцца з «апазіцыяй». У крайніх выпадках музыкі, мастакі і пісьменнікі могуць пераехаць у іншую краіну, але часцей за ўсё яны працягваюць працаваць у Беларусі і штодзённа сведчаць пра супярэчнасці і непрадуктыўнасць рэпрэсіўнай культурнай палітыкі, апантана засяроджанай на кантролі.

Як ужо адзначалася, статус беларускай мовы з'яўляецца адным з асноўных і самых складаных пытанняў у дыскусіі пра нацыянальную ідэнтычнасць і пра тое, што азначае быць беларусам. Сама мова часта атаясамляецца з палітычнай апазіцыяй прэзыдэнту Лукашэнку і з'яўляецца важным звяном ва ўсіх культурных дыскусіях для тых, хто хоча, каб яна больш актыўна выкарыстоўвалася, або тых, хто адчувае сябе камфортна ў якасці рускамоўных беларусаў і нават бачыць пагрозу з боку некаторых нацыяналістычных моўных поглядаў. Як на Украіне, так і ў Беларусі, існуе таксама прыярытэтны рэгіянальны аспект моўнай праблемы і тэндэнцыя заходне-усходняй дыхатаміі.

У кантэксце моўнага пытання важна адзначыць вельмі цікавыя падзеі, якія ў апошні час звязаны з палітыкай Міністэрства культуры. Мадэрнізуючы свой афіцыйны сайт, які, здаецца, адлюстроўвае больш разумны і адкрыты падыход да абмену інфармацыяй, міністэрства выкарыстоўвае як сродак зносін і беларускую мову, разам з рускай. Таксама беларуская мова выкарыстоўваецца для некаторых заяў міністэрства, што, магчыма, сімвалічна сведчыць, па крайняй меры, аб магчымасці некаторай прагматычнай лаяльнасці па моўных пытаннях з боку беларускага ўрада. Аднак не ясна, ці гэта робіцца проста ў процівагу шматлікім грубым і нетактоўным мерам, якія прымаюцца ўладамі для абмежавання тых, хто хоча ўзбагаціць і прынесці разнастайнасць у культурнае жыццё краіны. Здавалася б, відавочна, зыходзячы з вопыту іншых краін, што культурная палітыка кантролю, цэнзуры і рэпрэсій у канчатковым выніку ў доўгатэрміновай перспектыве прывядзе да тупіковай сітуацыі, і цікава ўбачыць, у якой ступені Міністэрства культуры мае здольнасць арыентаваць палітыку ў больш рэалістычным напрамку, у параўнанні з падыходам адчужэння, які ўлады выкарыстоўваюць сёння.

З прычыны аднабаковага іміджу Беларусі як «апошняй дыктатуры ў Еўропе», трэба звярнуць увагу на тры важныя асаблівасці беларускай культурнай сцэны.

Першая асаблівасць у тым, што культурная сцэна Беларусі мае сваю ўласную дынаміку. Напрыклад, у галіне пісьменства, выдавецкай дзейнасці і спеўнага мастацтва як на беларускай, так і на рускай мовах, а таксама і ў галіне мастацкай літаратуры і твораў для тэатра, склалася цікавая сітуацыя. Існуе абмежаваная колькасць якасных незалежных выдавецтваў, можна знайсці і жывую культурную журналістыку. Ужо згадваліся некаторыя аспекты высокаякаснай і вынаходніцкай дзейнасці, якая адбываецца ў інтэрнэце. Нават у тых сферах, дзе Беларусь традыцыйна не займала моцных пазіцый, як, напрыклад, ранейшая адсутнасць цэнтра сучаснага выяўленчага мастацтва, цяпер ідзе сур'ёзная праца і з'яўляюцца новыя распрацоўкі, вартыя ўвагі за межамі Беларусі.

Другая асаблівасць заключаецца ў тым, што статус «ізгоя», нададзены Беларусі палітычнымі сіламі ў Еўропе, з'яўляецца несправядлівым і таксама стварае сур'ёзныя штучныя бар'еры для людзей, якія працуюць у сферы мастацтва і культуры, як і для моладзі ў цэлым. Існуе рэальнае жаданне супрацоўніцтва з Еўропай і ўнікальны вопыт і перспектывы, якімі адукаваныя беларусы могуць істотна ўзбагаціць культурныя і мастацкія працэсы, якія адбываюцца ў іншых частках Еўропы. Як згадвалася вышэй, дыскусіі па пошуку і ўсведамленню нацыянальнай самасвядомасці і ідэнтычнасці беларусамі вядуцца сёння вельмі інтэнсіўна і павінны адбывацца па крайняй меры часткова і ў еўрапейскім кантэксце, ад якога Беларусь у цяперашні час пазбаўлена. Зыход са сцэны савецкай ідэнтычнасці (храналагічна далёкай ад маладога пакалення) і вызначэнне беларускай ідэнтычнасці ў цяперашні час займае цэнтральнае месца ў культурным развіцці і ў будучай культурнай палітыцы Беларусі. Відавочна ўзнікае пытанне, як ў гэты кантэкст упісваецца еўрапейскае вымярэнне, і наколькі значным яно можа быць. Можна было б сцвярджаць, што нізкі ўзровень бягучых палітычных кантактаў Еўропы і Беларусі павінен кампенсавацца асабліва актыўнымі і сур'ёзнымі ўзаемавыгаднымі кантактамі ў сферы мастацтва і культуры.

Трэцяя асаблівасць выклікана зменамі, якія адбываюцца ў сферы культуры Беларусі, і якія важна разглядаць не з палітычнага пункту гледжання, нават у выпадках, калі палітычнае вымярэнне прысутнічае. Пытанне аб старых савецкіх «творчых саюзах» з'яўляецца прыкладам, які адлюстроўвае патрэбу ў новых прадстаўнічых органах, якія б садзейнічалі развіццю кожнага суб-сектара культуры. Часам дзякуючы палітыцы ўладаў з'яўляюцца новыя прадстаўнічыя органы, напрыклад, узнікненне новага «саюза пісьменнікаў» або супольнасцяў па інтарэсах, згуртаваных вакол інтэрнэт-сайтаў. Іншымі словамі, змены, інавацыі і рэформы адбываюцца, часта яны ідуць знізу, нават пры наяўнасці аўтарытарнай «закамянеласці» некаторых афіцыйных структур.

# 3. Даследчы агляд

## 3.1. Кантэкст / Умовы

### 3.1.1. Пытанні заканадаўства, падаткаабкладання, рэгістрацыі і працаўладкавання, якія ўплываюць на культуру. Ступень, у якой гэтыя меры аказваюць падтрымку развіццю культуры і творчасці.

**а. Ступень непасрэднага ўплыву нацыянальнага заканадаўства (г.зн. як гэта ацэньваецца дзеячамі ў сферы культуры) на культурнае развіццё ці "ажыўленне" культурнага сектара, і ступень сур'ёзнасці праблемы.**

Нацыянальнае заканадаўства замаруджвае культурнае развіццё і ажыўленне культурнага сектара хутчэй не наўпрост, а апасродкавана (для прыкладу глядзіце, калі ласка, раздзел 3.1.1.б ніжэй).

**б. Калі нацыянальнае заканадаўства аказвае ўздзеянне на развіццё культуры і творчасці, ці з'яўляецца яно культурна-спецыфічным ці агульным?**

Нацыянальнае заканадаўства, якое аказвае ўздзеянне на развіццё культуры і творчасці, з'яўляецца як агульным, так і культурна-спецыфічным. Палітыка ў культуры і стратэгіі культурнага развіцця не былі публічна абвешчаны дзяржавай і ўладамі, а так званая стратэгія не з'яўляецца празрыстай. Дзяржаўная палітыка эфектыўна выключае любую магчымасць вольнай крытыкі ці свабоды слова.

Добрым прыкладам такога апасродкаванага стрымлівання ў культуры з'яўляецца ўказ, які патрабуе наяўнасці адмысловага дазволу ўлад для любога публічнага збору трох і больш асоб, які (дазвол) вельмі цяжка атрымаць; пры адсутнасці такога дазволу сход лічыцца правапарушэннем. Гэта азначае, што публічна выступаючай групе вулічных музыкаў ці мастакоў можа быць інкрымінавана адміністрацыйнае правапарушэнне (ці нават крымінальнае, калі гэта мае дачыненне да палітыкі), калі група не зарэгістравана і яе выступ не санкцыянаваны ўладамі загадзя.

**в. Прыклады дзеючага заканадаўства ў культурнай сферы, якое, здаецца, працуе добра.**

Цяжка вылучыць канкрэтныя прыклады.

**г. Новае ці палепшанае заканадаўства ў сферы культуры, скіраванае на рашэнне выяўленых праблем і апісанне гэтых праблем.**

Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі 2011-2015», прынятая Саветам Міністраў у снежні 2010, апісвае шляхі рашэння шматлікіх існуючых праблем. Яе мэтай з'яўляецца павышэнне ўзроўня сацыяльнай і эканамічнай эфектыўнасці ў культурнай сферы. Мэты дзяржаўнай праграмы наступныя:

- Захаванне і развіццё матэрыяльнай і духоўнай культурнай спадчыны
- Захаванне музейных калекцый Рэспублікі Беларусь і забеспячэнне іх даступнасці для грамадскасці
- Забеспячэнне даступнасці інфармацыйных рэсурсаў і бібліятэк у роўнай ступені для ўсіх сацыяльных груп насельніцтва
- Развіццё прафесійных мастацтваў
- Падтрымка айчынных вытворцаў кіна- і відэа-мастацтва, развіццё кінематографа
- Падтрымка і развіццё рамёстваў
- Развіццё сістэмы эстэтычнага выхавання, прафесійнай адукацыі ў сферы мастацтва, падтрымка таленавітай моладзі
- Развіццё даследаванняў у сферы культуры
- Фарміраванне іміджу краіны ўсярэдзіне краіны і за мяжой
- Распрацоўка нацыянальнага заканадаўства і эканамічнае развіццё сектара культуры

Асноўныя праблемы, якія павінны быць вырашаны:

- Стварэнне сістэмы нацыянальных прыярытэтаў у сферы культуры
- Прыцягненне прыватнага капіталу ў сферу культуры шляхам стымулявання спонсарства і дабрачыннасці
- Распрацоўка механізмаў супрацоўніцтва паміж дзяржавай і прыватнымі структурамі
- Падтрымка ініцыятыў і праектаў у сферы культуры
- Рэфармаванне сістэм кіравання і выкарыстанне новых тэхналогій у кіраванні ў сферы культуры
- Стварэнне ўмоў для эфектыўнага функцыянавання інстытута прадусараў
- Паляпшэнне якасці, адпаведнасці і суадносінаў кошт-якасць прафесійнай адукацыі ў сферы мастацтва
- Стымуляванне даследчых прац
- Эфектыўнае выкарыстанне дзяржаўнага фінансавання для распрацоўкі культурных прынцыпаў, заснаваных на даследаваннях
- Прасоўванне беларускай культуры за мяжой

Былі ці будуць унесеныя пэўныя змены ў заканадаўства, уключаючы змены і папраўкі ў законы пра дзейнасць музеяў і музейных фондаў, кінематографа, пра продаж электронных квіткоў у тэатры і на канцэрты. Пэўныя захады зроблены для паляпшэння кіравання бібліятэчнымі рэсурсамі і ў сферы прысуджэння прэмій і ўзнагарод, для ўнясення змен ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі канцэртаў» і падтрымкі выканаўцаў.[1]

У снежні 2011 года Савет Міністраў прыняў прапанову, скіраваную на развіццё супрацоўніцтва паміж дзяржавай і прыватнымі структурамі ў планаванні мерапрыемстваў у сферы культуры і стварэнні ўмоў для прасоўвання новых арыгінальных творчых ідэй.[2]

У лістападзе 2011 года Міністэрства адукацыі пастанавіла надаць Беларускай нацыянальнай акадэміі мастацтваў больш высокі статус у якасці *вядучага* адукацыйнага цэнтра ў сферы культуры.[3]

**д. Ступень, у якой падатковае заканадаўства стрымлівае культурнае развіццё ці ажыўленне культурнага сектара (г.зн. як гэта ацэньваецца прадстаўнікамі культурнага сектара).**

Падатковае заканадаўства не стрымлівае культурнае развіццё, але і не стымулюе яго. Усе арганізацыі абавязаны плаціць падатак на прыбыткі. З 2011 года прыбыткі тэатраў, кінатэатраў і кінастудый вызвалены ад выплаты падатку на дададзены кошт.

**е. Працэс рэгістрацыі недзяржаўных арганізацый і камерцыйных суб'ектаў у сферы культуры: працягласць, колькасць этапаў, плацяжы, складанасць.**

Этапы рэгістрацыі:

- Прадастаўленне дакументацыі
- Зацвярджэнне назвы арганізацыі
- Дазвол антыманапольнай камісіі
- Афармленне юрыдычнага адрасу ў нежылым памяшканні (за выключэннем унітарных аб'яднанняў)

Цяжкасць складаецца ў неабходнасці папярэдняй ухвалы назвы арганізацыі. Прынцып санкцыянаванасці ахоплівае грамадскія аб'яднанні, саюзы грамадскіх аб'яднанняў, фонды і рэлігійныя арганізацыі.

Рашэнне пра рэгістрацыю прымаецца на працягу аднаго месяца. Грамадскай арганізацыі можа быць адмоўлена ў рэгістрацыі, калі прадстаўленыя дакументы не знаходзяцца ў адпаведнасці з афіцыйнымі патрабаваннямі. На практыцы, рэгіструючыя органы могуць адмовіць у рэгістрацыі любой грамадскай арганізацыі, якая ім «не падабаецца», напрыклад, з-за памылкі ў нумары

[1] http://kultura.gov.by/temp/Culture2010.doc
[2] http://kultura.gov.by/news/ab-razv-tsts-dzyarzha-na-pryvatnaga-partnerstva-sfery-kultury
[3] http://kultura.gov.by/news/ab-pradasta-lenn-statusu-vyaduchai-stanovy-vysheishai-adukatsy-sfery-kultury

тэлефона яе заснавальніка. У большасці выпадкаў рашэнне залежыць ад палітычнай волі ўрада. Працэс рэгістрацыі праходзіць у адпаведнасці з правіламі. Сутнасць у тым, што правілы настолькі строгія, што вельмі лёгка знайсці памылкі, якія спыняць рэгістрацыю.

Незалежныя культурныя цэнтры не ўкараніліся ў Беларусі з-за заканадаўчых патрабаванняў наяўнасці памяшканняў, абсталявання і г.д., якія павінны быць выкананы заснавальнікам.

Кошт рэгістрацыі: 5 базавых велічынь для рэспубліканскіх арганізацый[4], 10 базавых велічынь для замежных арганізацый, 5 базавых велічынь для камерцыйных арганізацый і 0.5 базавых велічынь для асацыяцый і ўстаноў. Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце: http://minsk.gov.by/ru/org/8643/attach/cfab087/

### 3.1.2. Празрыстасць і карупцыя

**а. Рэйтынг краіны па індэксе Transparency International: бягучы і ў параўнанні з індэксамі за апошнія два гады.**

2011: радок 143, адзнака 2.4
2010: радок 127, адзнака 2.5
2009: радок 139, адзнака 2.4

**б. Любыя іншыя надзейныя крыніцы, якія ілюструюць існаванне прамой карупцыі ці наўмысную адсутнасць празрыстасці ў культурным сектары ці дзеянне карупцыі ў культурным сектары.**

Ёсць агульная згода ў асяроддзі прафесіяналаў у сферы культуры пра тое, што ўзровень карупцыі ў сектары вельмі вялікі. Лічыцца, што прызначэнні на высокія пасады адбываюцца хутчэй на аснове асабістых сувязяў, чым з улікам чыста прафесійных навыкаў.

«Адкаты» шырока практыкуюцца ва ўсіх сферах; напрыклад, у музейнай /галерэйнай сферы. Лічыцца, што адсутнічае празрыстасць у схеме ўзнагароды мастака і існуюць выпадкі, калі камісійныя сродкі дзеляцца з «наймальнікам».

Шоў-бізнэс фармуецца не рынкавымі механізмамі, а бюракратычнай машынай. Бізнэс не можа пазбегнуць супрацоўніцтва з бюракратамі, і гэта прыводзіць да вельмі высокага ўзроўню карупцыі. Пакуль мастакі залежаць ад службоўцаў, апошнія жадаюць вызначаных паслуг ад іх. Іншымі словамі, «выкарыстанне сувязяў» з'яўляецца найбольш шырока распаўсюджанай карупцыйнай схемай.

### 3.1.3. Забеспячэнне і распаўсюд афіцыйнай і грамадскай інфармацыі

**а. Ці ўтрымлівае вэб-сайт Міністэрства культуры інфармацыю пра дзеючае заканадаўства ў сферы культуры ці лёгкі доступ да яе?**

Вэб-сайт Міністэрства культуры ўтрымлівае ўсю інфармацыю пра дзеючае заканадаўства ў сферы культуры.

**б. Ступень карыснасці вэб-сайта Міністэрства культуры з пункту гледжання кансультацый і падтрымкі / фінансавання арганізацый / прыватных асоб у сферы культуры.**

Вэб-сайт Міністэрства культуры ўтрымлівае інфармацыю па магчымасцях кансультавання ў Міністэрстве (уключаючы інфармацыю пра гадзіны прыёму, імёны кансультантаў). Ён таксама забяспечвае інфармацыяй пра конкурсы, арганізаваныя Міністэрствам культуры.

[4] Існуе класіфікацыя мясцовых, рэспубліканскіх і міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь. Рэспубліканскай арганізацыі знаходзяцца ў падпарадкаванні міністэрстваў і органаў дзяржаўнага значэння.

**в. Даступнасць інфармацыі пра падтрымку / фінансаванне арганізацый і / ці прыватных асоб у сферы культуры, ажыццёўленую Міністэрствам культуры за папярэдні год ці перыяд, на міністэрскім вэб-сайце.**

Маюцца агульныя статыстычныя дадзеныя пра колькасць прыватных асоб і арганізацый, якія атрымалі падтрымку з бюджэту МК. У прыватнасці, паводле гэтых дадзеных, з 1996 па 2010 год Міністэрства выдала грантаў на 5 мільярдаў бел. руб. (прыблізна 478 687 еўра) больш за 1800 прыватных асоб, і 269 грантаў былі вылучаны для ажыццяўлення разнастайнай дзейнасці ў сферы культуры.[5]

**г. Даступнасць досыць падрабязнай інфармацыі пра бюджэт Міністэрства культуры, адлічэнні і фактычныя выдаткі на міністэрскім вэб-сайце.**

Вэб-сайт МК не змяшчае інфармацыі пра бюджэт Міністэрства. Аднак ёсць спасылка на справаздачу, складзеную МК, якая змяшчае інфармацыю пра яго бюджэт і выдаткі.[6]

**д. Калі інфармацыя па любым з пунктаў а-г не даступная на вэб-сайце Міністэрства культуры, ці з'яўляецца яна лёгка даступнай у электронным выглядзе (іншы вядомы вэб-сайт) ці ў друкаванай форме?**

Інфармацыя даступная на вэб-сайце Міністэрства культуры.

**е. Ступень выкарыстання вэб-сайта Міністэрства культуры (г. зн. вэб-статыстыка, напр. колькасць наведвальнікаў).**

Вэб-сайт Міністэрства культуры падае статыстыку толькі па запыце. Колькасць наведвалькікаў МК: 7 дзён, 2448; 30 дзён, 9477; у тым ліку беларускія наведвальнікі: 7 дзён, 1902; 30 дзён, 7303.

**ж. Наяўнасць крыжаваных спасылак, якія маюць дачыненне да сферы культуры, сумеснага планавання і правядзення культурных мерапрыемстваў, на вэб-сайт Міністэрства культуры з боку іншых міністэрстваў ці цэнтральных або мясцовых органаў улады па праблемах адукацыі, моладзі, ліцэнзавання і г.д.**

Ёсць крыжаваныя спасылкі на міністэрскі вэб-сайт з боку Нацыянальнага прававога вэб-сайта[7] і вэб-сайта Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

### 3.1.4. Інтэграцыя культурных праграм у іншыя праграмы і стратэгіі

**а. Даступнасць дакументаў ці іншых афіцыйных крыніц інфармацыі пра дзяржаўныя праграмы**

Дакументы пра дзяржаўныя праграмы даступныя на вэб-сайце Міністэрства культуры.

**б. Прыклады сумесных мерапрыемстваў міністэрстваў / ведамстваў / падраздзяленняў.**

Адным з самых свежых прыкладаў сумесных мерапрыемстваў паміж міністэрствамі з'яўляецца дамова паміж Міністэрствам культуры і Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях, «скіраваная на развіццё і папулярызацыю беларускай культуры, прапаганду духоўнасці, патрыятызму і дзяржаўнасці, шляхам удзелу памежнікаў у азнаямленні з гістарычным мінулым Беларусі, яе традыцыямі і культурай». Дасягненне мэты мяркуецца ажыццяўляць шляхам групавых візітаў у музеі, тэатры і на выставы[8].

**в. Рэгулярнае афіцыйнае і нефармальнае планаванне, кансультацыі ці падобныя сустрэчы.**

Ёсць доказы пра правядзенне Міністэрствам культуры рэгулярных сустрэч і калегіумаў.

[5] http://kultura.gov.by/fund/spetsyyalny-fond-prez-denta-respubl-k-belarus-pa-padtrymtsy-talenav-tai-moladz-1
[6] http://kultura.gov.by/temp/Culture2010.doc
[7] http://www.pravo.by/
[8] http://kultura.by/news/ab-padp-sann-pagadnennya-ab-uzaemadzeyann-supratso-n-tstve-pam-zh-m-n-sterstvam-kultury-respubl

### 3.1.5. Справаздачнасць і адкрытасць на практыцы

**а. Афіцыйныя і рэгулярныя кансультацыі і брыфінгі з: (1) прадстаўнікамі сферы культуры; і (2) прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі.**

Адзначана два выпадкі (у студзені 2011 і студзені 2012) кансультацыйных сустрэч з прадстаўнікамі сферы культуры і СМІ, замежнымі дыпламатамі і прадстаўнікамі замежных арганізацый у сферы культуры, зарэгістраваных у Беларусі.

**б. Рэгулярнасць забеспячэння зацікаўленай грамадскасці агульнай інфармацыяй пра праграмы, бюджэт і мерапрыемствы.**

Зацікаўленыя асобы могуць знайсці агульную інфармацыю пра праграмы, бюджэт і мерапрыемствы на вэб-сайце МК. Нават быў выпадак анлайн канферэнцыі з міністрам Паўлам Латушка, дзе любы жадаючы мог задаць пытанні. Трынаццаць пытанняў і адказаў можна знайсці на вэб-сайце Міністэрства культуры[9].

**в. Грамадская даступнасць бізнэс-планаў і планавых паказчыкаў улад, адказных за сферу культуры.**

МК рэгулярна публікуе інфармацыю пра свае ініцыятывы, але падрабязныя бізнэс-планы недаступныя для шырокай грамадскасці.

### 3.1.6. Унёсак у сферу культуры

**а. Доказы і разуменне прафесіяналамі ў сферы культуры ўзроўню дасведчанасці з боку цэнтральных і мясцовых органаў улады пра патэнцыйную ролю культуры і мерапрыемстваў у сферы культуры для сацыяльнага і эканамічнага развіцця, сацыяльнай цэласнасці, вырашэння канфліктаў і ўнутрыкультурнага дыялогу.**

Тэарэтычна, цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады дасведчаныя пра патэнцыйную ролю і ўнёсак культуры і мерапрыемстваў у сферы культуры ў сацыяльнае і эканамічнае развіццё, сацыяльную цэласнасць, вырашэнне канфліктаў і ўнутрыкультурны дыялог. На практыцы, аднак, атрымліваецца, што менавіта ўлады адказныя за сацыяльную напружанасць і канфлікты. Прыкладам гэтага з'яўляецца чорны спіс музыкаў і мастакоў[10]. Тым не менш, у апошні час назіраецца відавочны прагрэс, які можна адлюстраваць на двух добрых прыкладах, адным з якіх з'яўляецца выстава незалежнага сучаснага беларускага мастака Руслана Вашкевіча ў Нацыянальным музеі мастацтваў, а іншым - прэмія, выйграная незалежнай групай «Троіца» у Нацыянальным музычным конкурсе ў намінацыі «Лепшая музычная группа». Гэта выглядае як спроба аб'яднання розных сацыяльных груп.

Ёсць агульнае ўсведамленне важнасці культурнай сферы для эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выказаў гэта наступным чынам: «Без развітай духоўнай культуры няма дзяржавы. Культура фарміруе дух нацыі! Вось чаму на першы план вылучаецца задача маральнага выхавання чалавека, захавання і ўмацавання культурных і ідэалагічных асноў дзяржавы і грамадства»[11].

**б. Даступнасць і якасць статыстыкі, даследаванняў і інфармацыі, якая датычыцца дадзенай сферы.**

Няма звестак.

[9] http://kultura.by/news/natsyyanalnaya-kultura-agulny-zdabytak-agulny-klopat
[10] http://gazetaby.com/index.php?sn_nid=34850&sn_cat=33
[11] http://kultura.gov.by/temp/Culture2010.doc

### 3.1.7. Роля незалежнага сектара і НДА

**а. Разуменне (не)важнасці і патэнцыялу недзяржаўнага сектара ў сферы культуры з боку:**

- **Цэнтралізаванай улады**
- **Мясцовай улады**

Міністрам культуры было зроблена некалькі афіцыйных заяў на карысць незалежнага сектара ў культуры. У снежні 2011 года Савет Міністраў прыняў прапанову, скіраваную на развіццё супрацоўніцтва паміж дзяржавай і прыватнымі структурамі па пытаннях планавання ў сферы культуры і стварэння ўмоў для прасоўвання новых арыгінальных творчых ідэй[12].

**б. Разуменне (не)важнасці і патэнцыялу недзяржаўнага сектара ў сферы культуры прафесіяналамі ў сферы культуры.**

Пытанне пра патэнцыял і важнасць будзе абмяркоўвацца ў раздзеле 4.1.8.а., паколькі праблемы, з якімі сутыкаюцца НДА і бізнэс, больш ці менш падобныя.

**в. Колькасць зарэгістраваных НДА ў сферы культуры.**

Паводле дадзеных «Партала беларускіх НДА»[13], колькасць зарэгістраваных НДА ў сферы культуры складае 349; і таксама 41 фонд.

**г. Колькасць дзеючых зарэгістраваных НДА ў сферы культуры.**

Няма дадзеных.

**д. Колькасць зарэгістраваных НДА ў сферы культуры ці незалежных некамерцыйных арганізацый у сферы культуры, у якіх працуе больш за 15 чалавек.**

Няма дадзеных.

### 3.1.8. Роля прыватнага і камерцыйнага сектара.

**а. Разуменне важнасці і патэнцыялу камерцыйнага сектара ў сферы культуры з боку:**

- **Цэнтралізаванай улады**
- **Мясцовай улады**
- **Прафесіяналаў камерцыйнага сектара ў сферы культуры**
- **Прафесіяналаў некамерцыйнага сектара ў сферы культуры**

Стаўленні прафесіяналаў камерцыйнага і некамерцыйнага сектара ў сферы культуры практычна ідэнтычныя. Прадстаўнікі абедзвюх прафесійных супольнасцяў згодныя з тым, што нацыянальная музычная індустрыя не інтэграваная ў шырэйшую міжнацыянальную музычную супольнасць, і што прычына гэтага ў адсутнасці інтэграцыі нацыянальнай эканомікі ў сусветную эканоміку. Гэта спараджае праблемы, як для прадпрымальнікаў, так і для вытворцаў, а таксама для дзяржаўных арганізацый.

Шоў-бізнэс ці бізнэс у сферы музычнай культуры ў Беларусі цалкам залежыць ад дзяржаўнага апарата, а не ад рынкавых механізмаў. Як ужо гаварылася вышэй, мастакі залежаць ад дзяржаўных службоўцаў і дзяржаўныя службоўцы, у сваю чаргу, чакаюць «паслуг» ад мастакоў.

Функцыю вытворцаў і гуказапісвальных цэнтраў выконваюць дзяржаўныя тэлевізійныя каналы і некалькі дзяржаўных радыёстанцый, г.зн. дзяржаўныя СМІ. Функцыю прасоўвання выконваюць аддзелы мясцовых органаў улады. Увогуле, прамоўтарам з'яўляецца той, хто падае сцэну для выканання. Колькасць прыватных сцэн вельмі малая. Колькасць прыватных клубаў, якія прасоўваюць нацыянальную музыку, яшчэ меншая. Ёсць каля 5 сцэн у Мінску і 10 у Беларусі. Нацыянальная музыка не з'яўляецца рынкавым/камерцыйным прадуктам. Камерцыйна больш

[12] http://kultura.gov.by/news/ab-razv-tsts-dzyarzha-na-pryvatnaga-partnerstva-sfery-kultury
[13] http://en.ngo.by/

выгадна запрашаць замежных выканаўцаў. Беларуская музыка не можа спаборнічаць; такім чынам, патэнцыял беларускай культуры, у прыватнасці, у музыцы вельмі абмежаваны.

Асноўная доля спажыванай прадукцыі ў сферы культуры вырабляецца за мяжой (у Расіі, ЗША, Еўропе і інш.). Толькі традыцыйная музычная спадчына, прадстаўленая ў сучасных формах, можа быць канкурэнтаздольнай. Прыкладамі з'яўляюцца групы «Троіца» і «Палац», якія выконваюць аўтэнтычны фальклор. Дыджэі выкарыстоўваюць замежную музыку і няма дыджэяў, якія міксуюць беларускую этна-музыку.

Варта згадаць, што ў Беларусі ўжо няма фабрык па вытворчасці музычных інструментаў. Такім чынам, мясцовыя музыкі змушаны купляць замежныя інструменты нават для выканання нацыянальнай музыкі.

Стан камерцыйнага сектара ў сферы культуры як найлепш можа быць праілюстраваны на наступных прыкладах: добра вядомая вядучая група «Палац»[14] складаецца з сямі музыкаў, і заробак выканаўцаў за канцэрт складае ўсяго 1200 еўра. Падобная сітуацыя з такімі групамі, як «Крама»[15], «N.R.M.»[16] і інш. У іх няма вялікіх сцэн для правядзення канцэртаў, як гэта было год таму. Цяпер яны граюць толькі для невялікіх аўдыторый, паколькі яны ў «дзяржаўным чорным спісе». Хоць гэты «чорны спіс» і неафіцыйны, але ён эфектыўна блакуе доступ у любую канцэртную залу для гэтых груп. Незалежны тэатр, адзін з некалькіх сапраўды незалежных тэатраў, таксама знаходзіцца ў «чорным спісе».

Мастакі наогул не прадстаўлены на сусветным рынку. Некаторыя з іх прадаюць свае працы за мяжой, але гэта нерэгулярная практыка. Сярэдняя па памеры карціна вядомага беларускага мастака, які часта выстаўляецца, будзе каштаваць каля 400-800 еўра. Гравюра будзе каштаваць каля 40-60 еўра. Высокарэнтабельны рынак ацэньвае пэўныя працы Руслана Вашкевіча і Уладзіміра Цэслера не менш чым у 8 000 еўра.

**б. Колькасць зарэгістраваных бізнесаў, якія з'яўляюцца часткай сектара ў сферы культуры, ці любыя надзейныя статыстычныя дадзеныя па камерцыйных мерапрыемствах у сферы культуры.**

Няма звестак.

**в. Фінансавы зварот у камерцыйным сектары ў сферы культуры, калі ёсць афіцыйныя статыстычныя дадзеныя ці любыя іншыя надзейныя крыніцы.**

Няма звестак.

**г. Колькасць камерцыйных арганізацый і кампаній у сферы культуры, у якіх працуе больш за 50 чалавек.**

Дадзеныя не знойдзены.

### 3.1.9. Нацыянальныя традыцыйныя і электронныя сродкі масавай інфармацыі, доля публікацый у сферы культуры і па праблемах культуры

**а. Колькасць адмысловых выданняў у сферы культуры, іх чытацкая аўдыторыя і тыражы.**

- Газеты (штотыднёвыя): «Культура» (тыраж 8541), «Літаратура і мастацтва» (тыраж 2855)
- Часопісы (штомесячныя): «Мастацтва» (тыраж 2041), «Партэр», «На Экранах», «Дзеяслоў»
- Часопісы (штоквартальныя): «Partisan», «Arche», «ПРАСВЕТ», «ТОПАС» (тыраж 300)

[14] http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9F%D0%B0%D0%BB%D0%B0%D1%86
[15] http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9A%D1%80%D0%B0%D0%BC%D0%B0
[16] http://ru.wikipedia.org/wiki/N.R.M.

**б. Колькасць важных і карысных «культурных вэб-сайтаў», якія шануюцца прафесіяналамі ў сферы культуры.**

5 – 10.

(i) Дзяржауныя
- www.kultura.gov.by
- http://www.dziejaslou.by/

(ii) Прыватныя
- www.budzma.org
- http://n-europe.eu/
- www.34mag.net
- http://belintellectuals.eu/about
- www.artaktivist.org
- http://www.belaruspartisan.org
- http://gender-route.org

**в. Даступныя статыстычныя дадзеныя, якія ілюструюць ступень выкарыстання такіх вэб-сайтаў, напр. колькасць наведвальнікаў і г.д.**

Статыстыка, як правіла, недаступная на вэб-сайтах:

- http://artaktivist.org/, 550 наведнікаў кожны дзень
- http://kyky.org/ (1076 чытачоў у Twitter, 2487 чытачоў на Facebook, 1707 чытачоў на vkontakte.ru)

**г. Ступень асвятлення культурных мерапрыемстваў і дыскусій у мясцовай прэсе і СМІ, узятая за тыпавы тыдзень (г.зн. колькасць артыкулаў і аб'яў у вядучых штодзённых і штотыднёвых газетах / часопісах; колькасць згадванняў у СМІ, інтэрв'ю ці праграм, прысвечаных падзеям у сферы культуры).**

Некаторыя навіны пра *галоўныя* культурныя падзеі могуць з'яўляцца ў канцы тэлевізійных выпускаў навін, і вядучыя газеты маюць калонку, прысвечаную падзеям у культуры. Галоўныя інтэрнэт-парталы маюць старонку, прысвечаную культуры. Дзяржаўныя СМІ асвятляюць культурныя падзеі, якія праводзяцца дзяржавай. Дэбаты і дыскусіі звычайна арганізоўваюцца і асвятляюцца недзяржаўным сектарам. Яны звычайна адбываюцца ў інтэрнэце.

Падзеям у культуры прысвечана пяць нацыянальных тэлевізійных праграм.

**д. Ацэнка прафесіяналамі ў сферы культуры ці іншыя доказы змены цікавасці да культуры і праблем культуры мясцовых друкаваных і электронных СМІ, спецыялізаваных інфармацыйных агенцтваў за апошнія два гады.**

За апошнія два гады цікавасць да культуры з боку мясцовых друкаваных і электронных СМІ, спецыялізаваных выданнях, як дзяржаўных, так і незалежных, узрасла. З'явілася некалькі новых вэб-рэсурсаў і тэлевізійных шоў.

## 3.1.10. Адрозненні паміж гарадской і сельскай мясцовасцю з пункту гледжання папулярызацыі культуры і доступу да культурнай сферы

**Сведчанне (г.зн. стратэгічныя дакументы, заявы Міністэрства, асвятленне ў афіцыйнай прэсе і СМІ) важнасці ці прыярытэтнасці, нададзенай уладамі гэтай сферы.**

Адрозненні паміж гарадской і сельскай мясцовасцю ў Беларусі значныя. Улады ўсведамляюць гэтыя вялікія адрозненні, і развіццё сельскай мясцовасці з'ўляецца важным прыярытэтам урада. Найболей істотнымі праблемамі культурнага развіцця сельскай мясцовасці з'яўляюцца адраджэнне пэўных тыпаў народнага мастацтва і рамёстваў і арганізацыя мабільных культурных аб'ектаў для забеспячэння большай даступнасці культурнага жыцця для маланаселеных рэгіёнаў.

Адной з ініцыятыў папулярызацыі культурнага развіцця сельскай мясцовасці з'яўляюцца штогадовыя фэсты, такія як «Званы Сафіі», «Славянскі кірмаш» у Віцебску, «Музы Нясвіжа», «Фэст нацыянальнай культуры» ў Гародні, «Дажынкі», «Дударскі фэст» і іншыя, якія праводзяцца ў розных рэгіёнах. У агульнай колькасці, у Беларусі праводзіцца 58 фэстаў[17].

Даследаванні, праведзеныя Міністэрствам культуры, сведчаць аб значным прагрэсе ў культурным развіцці сельскай мясцовасці. Напрыклад, у 2008, 2009 і 2010 гадахбылі адкрыты, адпаведна, 18, 3 і 8 новых «Дамоў рамёстваў» і 224, 39 і 38 мастацкіх гурткоў і школ для дзяцей[18]. Аднак афіцыйная інфармацыя сфакусавана хутчэй на колькасным, чым на якасным баку гэтых дасягненняў.

### 3.1.11. Пытанні мовы

**Бягучая дынаміка змен у параўнанні з сітуацыяй двума гадамі раней (пазітыўная / негатыўная).**

Афіцыйнымі мовамі ў Беларусі з'яўляюцца беларуская і руская, але на практыцы і ў палітыцы прыярытэт аддаецца рускай мове, у той час як выкарыстанне беларускай мовы зведзена да мінімуму і яна практычна блакуецца. Апроч гэтага выкарыстанне беларускай мовы часта звязваецца з апазіцыйнымі групамі, якія настроены супраць існуючага палітычнага рэжыму. Аднак варта адзначыць, што пры апошнім Міністры, Паўле Латушка беларуская мова стала афіцыйнай мовай Міністэрства культуры нароўні з рускай мовай. Уся новая дакументацыя публікуецца на беларускай мове, і Міністр размаўляе на беларускай мове. Беларуская мова выкарыстоўваецца некаторымі музыкамі, артыстамі, пісьменнікамі, кінарэжысёрамі, гісторыкамі і крытыкамі, але, тым не менш, большасць публікацый і дыскусій вядзецца на рускай мове.

Вышэйшая адукацыя вядзецца ў большасці выпадкаў на рускай мове. Ёсць 8 дзяржаўных школ, дзе ўсе прадметы вывучаюцца на беларускай мове, і 7 дзяржаўных школ з беларускамоўнымі класамі. У рускамоўных школах толькі 2-3 гадзіны ў тыдзень прысвечаны беларускай мове і яшчэ 1-2 гадзіны - беларускай літаратуры. Паводле перапісу 2009 года, толькі 6% грамадзян пацвердзілі выкарыстанне беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці[19].

Радыё і тэлебачанне пераважна рускамоўныя. Ёсць некалькі праграм, якія транслююцца на беларускай мове, але нават выпускі навін на Першым нацыянальным канале прадстаўлены на рускай мове. Прэзідэнт размаўляе на рускай мове.

Праблема беларускай мовы вельмі актуальная ў Беларусі. Дамінаванне рускай мовы і папулярызацыя каштоўнасцяў Рускай Праваслаўнай Царквы стварае атмасферу, у якой беларуская культура разглядаецца як рудымент паганскага мінулага і суб-культура Расійскай імперыі. Сітуацыя, відавочна, няправільная, але меры барацьбы з ёй знаходзяцца толькі на пачатковай стадыі развіцця.

Таксама існуе агульная праблема таго, што беларускія дзеці выхоўваюцца на чужых каштоўнасцях (рускіх, еўрапейскіх і амерыканскіх).

[17] http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9A%D1%83%D0%BB%D1%8C%D1%82%D1%83%D1%80%D0%B0_%D0%91%D0%B5%D0%BB%D0%BE%D1%80%D1%83%D1%81%D1%81%D0%B8%D0%B8

[18] Беларуская культура сёння. Гадавыагляд 2010. Мн.: БДУ культуры і мастацтваў. - 2011.

[19] http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%91%D0%B5%D0%BB%D0%BE%D1%80%D1%83%D1%81%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B9_%D1%8F%D0%B7%D1%8B%D0%BA#cite_note-3

## 3.2. Стварэнне / вытворчасць і захаванне / рэстаўрацыя

### 3.2.1. Адносная значнасць, якая надаецца сучаснай культурнай творчасці згодна нацыянальным праграмам у сферы культуры і на практыцы (г.зн. фінансаванне)

**Сведчанне зацікаўленасці ўлад у развіцці і падтрымцы сучасных мастакоў, аўтараў і вытворцаў на прыкладзе адпаведных праграм развіцця, бюджэтнага фінансавання, праграмных заяў і спасылак Міністэрства (г.зн. згадвання ў заявах).**

Як і ў большасці сфер, цікавасць улад да сучаснай культуры вельмі высокая і выяўляецца ў актыўным умяшанні ўлады ў гэту сферу. Адным з прыкладаў з'яўляецца адкрыццё Цэнтра сучаснага мастацтва ў Мінску ў канцы 2011 года пры фінансавай падтрымцы МК. Міністр культуры нядаўна пачаў выяўляць афіцыйную цікавасць да сучаснага мастацтва, наведваючы адкрыцці выстаў, арганізаваных як дзяржаўным, так і недзяржаўным сектарам у сферы культуры.

У 2011 годзе Беларусь мела афіцыйны павільён на венецыянскім Біенале. Такое прасоўванне Беларусі адбываецца вельмі цяжка з-за напружанасці паміж мастацкай цэласнасцю і свабодай з аднаго боку і выкарыстаннем дзяржавай мастацтва на міжнародным узроўні ў сваіх мэтах, асабліва з улікам палітычнага кантэксту культуры ў Беларусі.

Сапраўды, заканадаўства апасродкавана стрымлівае развіццё сучаснага мастацтва, напрыклад: Указ 2002 года ўсталёўвае правілы вызначэння аплаты за стварэнне прадметаў выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва[20]. Найбольш высокая аплата вызначана за працы вялікага памеру па гістарычных матывах, партрэты рэальных людзей, працы, выкананыя ў бронзе, калі гаворка ідзе пра скульптуру, ці працы, выкананыя алеем на палотнішчы, калі гэта карціны і г.д. Малагабарытныя прадметы мастацтва маюць самыя нізкія тарыфныя стаўкі. Адмыслоўцы, якія ацэньваюць кошт працы, рэальна не ацэньваюць, напрыклад, абстрактнае мастацтва, аддаючы перавагу традыцыйным формам мастацтва.

У снежні 2011 года 370 мільёнаў бел. руб. (прыблізна 37 000 еўра) было выдаткавана для падтрымкі таленавітай моладзі. Гэтыя грошы былі накіраваны на прызначэнне 22 стыпендый, 40 грантаў на падтрымку талентаў і прэмій, а таксама двум актыўным удзельнікам падзей у сферы мастацтва.

У 2011 годзе Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі вылучыў 1.1 мільярд бел. руб. (прыблізна 100 000 еўра) на фінансавае заахвочванне таленавітай моладзі, арганізацыю міжнародных і нацыянальных конкурсаў, выстаў і іншых падзей, прысвечаных пошуку таленавітай моладзі, а таксама для закупу музычных інструментаў, тэатральных касцюмаў, абсталявання і г.д..

Дадаткова 154.92 мільёна бел.руб. (15 000 еўра) былі зарэзерваваны для прысуджэння ўзнагарод, прэмій і стыпендый, закупу тэатральных касцюмаў, музычных інструментаў і стыпендый для навучання ў Расіі[21].

У той час як некаторыя асобы атрымліваюць фінансавую падтрымку ад урада, ёсць іншыя прыклады, калі ўлады не стрымліваюць сваіх абяцанняў па пытаннях фінансавання сучаснай культурнай творчасці. Менавіта гэта адбываецца ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва. Дыпламатычныя місіі і замежныя арганізацыі рэгулярна робяць прапановы супрацоўніцтва ў розных праектах, для большасці з якіх патрабуецца толькі невялікае сумеснае фінансаванне з боку Міністэрства культуры. Аднак звычайная практыка Міністэрствы культуры - немагчымасць знайсці сродкі для ўдзелу.

[20] http://pravoby.info/docum09/part23/akt23498.htm
[21] http://www.belta.by/ru/all_news/president/Na-podderzhku-talantlivoj-molodezhi-Belarusi-v-2011-godu-vydeleno-Br11-mlrd_i_555782.html

### 3.2.2. Апісанне ўмоў ажыццяўлення розных відаў культурнай і мастацкай творчасці / вытворчасці

**Пэўныя паказальныя станоўчыя і адмоўныя прыклады падтрымкі з боку ўлад ці яе адсутнасці**

**(i) З выкарыстаннем шкалы:**

- **Моцная падтрымка**
- **Падтрымка**
- **Ні падтрымка, ні адмова**
- **З цяжкасцю**
- **Адмоўна**

Для атрымання падтрымкі ўлад творчыя людзі павінны дэманстраваць каштоўнасці, якія прасоўваюцца дзяржавай. Такім чынам, агульныя ўмовы для творчасці могуць быць апісаны як цяжкія, таму што не існуе ўмоў для свабоды думкі і выказвання,.

**(ii) Разуменне дзейснымі прадстаўнікамі сферы мастацтва сваёй творчай і працоўнай прасторы**

Большасць рэспандэнтаў разглядае творчую і працоўную прастору як неспрыяльную і цяжкую.

### 3.2.3. Творчасць

**a. Праграмныя дакументы, заявы ці афіцыйныя выказванні па тэме творчай дзейнасці і канцэпцыя «творчай эканомікі».**

Няма праграм развіцця па тэме творчай дзейнасці ці канцэпцыі «творчай эканомікі». Таксама «творчая дзейнасць» не з'яўляецца прадметам абмеркавання ў СМІ, прэсе ці спецыялізаваных часопісах ці на форумах.

**б. Разуменне сярод прафесіяналаў у сферы культуры ступені асветленасці творчай дзейнасці ў агульных і спецыялізаваных друкаваных і электронных выданнях (г.зн. вялікая зацікаўленасць/ сур'ёзная зацікаўленасць/ нязначная зацікаўленасць/ адсутнасць зацікаўленасці).**

«Адсутнасць зацікаўленасці» будзе найбольш трапным адказам, бо няма сведкаў аб наяўнасці такога прадмета абмеркавання ў загалоўках СМІ.

### 3.2.4. Культурная спадчына

**a. Асноўныя бягучыя праблемы, якія датычацца культурнай спадчыны:**

- **З пункту гледжання афіцыйнай улады, г.зн. Міністэрства культуры ці муніцыпальнай улады**
- **З пункту гледжання працуючых спецыялістаў**
- **З пункту гледжання грамадзянскай супольнасці/ грамадскіх груп і аб'яднанняў, уключаючы меншасці**

Паводле закона «Пра захаванне культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», асноўнымі прынцыпамі нацыянальнай стратэгіі ў сферы культурнай спадчыны з'яўляюцца:

- Прызнанне культурнай спадчыны як фактару развіцця дзяржавы
- Адказнасць дзяржавы за захаванне культурнай спадчыны
- Удзел грамадзянскай супольнасці ў захаванні культурнай спадчыны

Асноўныя праблемы на шляху ажыццяўлення нацыянальнай стратэгіі па захаванню культурнай спадчыны наступныя:

- Пошук матэрыяльных і нематэрыяльных аб'ектаў, якія могуць мець гісторыка-культурную каштоўнасць
- Прысваенне статусу аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны матэрыяльным і нематэрыяльным каштоўнасцям; улік аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны

- Захаванне і аднаўленне помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны
- Фінансавая падтрымка помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны з розных крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь

Асноўнымі праблемамі з пункту гледжання працуючых спецыялістаў з'яўляецца адсутнасць аўтэнтычных матэрыялаў (частак архітэктуры, прыкладнога мастацтва) і адсутнасць яснай канцэпцыі развіцця ў сектары[22].

Працуючыя спецыялісты відавочна падзелены на два лагеры. Ёсць спецыялісты, зацікаўленыя ў даследаваннях і развіцці, і яны робяць свой унёсак у гэту сферу ў адпаведнасці з іх спецыялізацыяй. Яны адкрытыя для інавацый і творчасці. У той жа час яны не маюць магчымасці выявіць сваю ініцыятыву, але абавязаны выконваць задачы, пастаўленыя «кіраванцамі». Другі лагер складаецца галоўным чынам, хоць гэта можа быць і перабольшаннем, з кіраванцаў, меньш абавязковых, і чыя асноўная цікавасць не заўсёды чыста прафесійная, і ў некаторых выпадках яны таксама могуць быць залучаны ў практыку «адкатаў». Як вынік, другі лагер прыносіць шмат шкоды самой сферы ў цэлым, паколькі яны могуць выкарыстоўваць спецыялістаў ніжэйшага ўзроўню замест таго, каб прыцягваць і аплочваць высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Сітуацыя пагаршаецца тым фактам, што адсутнічае сувязь паміж спецыялістамі першага лагера і ўладамі, так што ўлады бачаць толькі пазіцыю «кіраванцаў» і не дасведчаныя пра тыя надзённыя праблемы, якія вымушаны пераадольваць спецыялісты. У выніку супрацоўніцтва паміж living рознымі ўзроўнямі спецыялістаў амаль што не адбываецца.

З пункту гледжання грамадзянскай супольнасці, у апошні час назіраецца некаторая актыўнасць у сферы абнаўлення і аднаўлення культурнай спадчыны. Былі адноўлены замкі ў Міры, Нясвіжы і Гомелі. Яны прыцягваюць увагу турыстаў. У той жа час, шматлікія старыя будынкі ў цэнтры Мінска, пабудаваныя ў 18-м стагоддзі, былі знесеныя з прычыны іх аварыйна-небяспечнага стану. Іх збіраюцца нанова адбудаваць на тым жа месцы ў адпаведнасці са старымі планамі, але з выкарыстаннем сучасных матэрыялаў, ці рабіць «муляжы святой Русі за паўгадзіны», як у песні Грабеншчыкова[23].

У гістарычным цэнтры Нясвіжа два будынкі, пабудаваныя ў канцы 19-га стагоддзя, былі нелегальна знесены па тых жа прычынах. Ёсць доказы такіх жа зносаў у іншых месцах.

У Мінску некалькі будынкаў, разбураных у мінулыя стагоддзі, былі адбудаваны нанова (напр. ратуша[24], гатэль «Еўропа»[25] і Царква Святога Духа (зараз гэта Дзіцячая філармонія)[26].

**6. Ступень уцягнутасці грамадзянскай супольнасці і/ ці грамадскіх груп у любую дзейнасць у сферы захавання культурнай спадчыны, афіцыйна ці неафіцыйна паводле даступных надзейных доказаў (колькасць зарэгістраваных ці вядомых груп/ аб'яднанняў, колькасць праектаў/ сайтаў, наяўнасць адпаведных бюлетэняў, вэб-сайтаў і т. д.).**

Ёсць доказы ўдзелу грамадзянскай супольнасці і грамадскіх груп у дзейнасці ў сферы захавання культурнай спадчыны, пераважна ў рэгіёнах. Гэты ўдзел, галоўным чынам, неафіцыйны, але яго ўнёсак надзвычай важны для рэгіянальнага культурнага развіцця. Усе ўдзельнікі вельмі зацікаўлены ў гэтай сферы, і робяць гэта добраахвотна. Добрым прыкладам служыць унёсак, звязаны з Магілёўскім абласным мастацкім музеем імя П. В. Масленікава.

[22] http://nesvizh.by/219-problemy-restavracii-zamka-teper-budut-obsuzhdatsya-sistematicheski.html
[23] Барыс Грабеншчыкоў з'яўляецца адным з найбольш вядомых прадстаўнікоў пакалення, якое шырока лічыцца «бацькамі-заснавальнікамі» рускага року: http://en.wikipedia.org/wiki/Boris_Grebenshchikovhttp://www.youtube.com/watch?v=_MjTJWRYRJY&feature=related
[24] http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%A0%D0%B0%D1%82%D1%83%D1%88%D0%B0_(%D0%9C%D0%B8%D0%BD%D1%81%D0%BA)
[25] http://www.hoteleurope.by/about_hotel/history/
[26] http://www.belta.by/ru/all_news/society/Detskaja-filarmonija-otkrylas-v-Minske_i_571932.html

### 3.2.5. Рэстаўрацыйныя рэсурсы і магутнасці

**а. Колькасць, тып і колькасць выпускнікоў навучальных устаноў ці прафесійных навучальных ўстаноў і забеспячэнне рэстаўратарамі музеяў і аб'ектаў культурнай спадчыны.**

Вядучым навучальным цэнтрам з'яўляецца Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, і курс навучання складае шэсць гадоў.

**б. Ступень задавальнення попыту на кваліфікаваных рэстаўратараў паводле меркавання невялікага, але прадстаўнічага кола спецыялістаў (службоўцаў, дырэктараў музеяў, кіраўнікоў па планаванні ў сферы захавання культурнай спадчыны).**

У Беларусі ёсць высокакваліфікаваныя рэстаўратары культурнай спадчыны, хоць іх не так шмат. Яны выдатна навучаны тэхналогіям рэстаўрацыі, якія выкарыстоўваюцца ў свеце. Шматлікія з іх навучаліся за мяжой, большасць у Расіі. Прапанова адпавядае попыту. Фінансаванне з'яўляецца праблемай, г.зн. часам рэстаўратары змушаны вельмі эканомна расходаваць матэрыялы, патрэбныя для рэстаўрацыйнай працы.

**в. Ступень, у якой навучэне рэстаўратараў з'яўляецца аб'ектам зацікаўленасці ці заклапочанасці для зацікаўленых бакоў (г.зн. МК, дырэктараў музеяў, кіраўнікоў па планаванні ў сферы захавання культурнай спадчыны).**

Адукаваныя рэстаўратары не з'яўляюцца сферай цікавасці ці заклапочанасці МК ці дырэктараў музеяў ці кіраўнікоў па планаванні ў сферы захавання культурнай спадчыны.

### 3.2.6. Канвенцыя ЮНЭСКА па абароне і папулярызацыі культурнай разнастайнасці

**а. Узровень дасведчанасці ў краіне (ацэнены шляхам анкетавання невялікай прадстаўнічай групы адмыслоўцаў па планаванні культурнага развіцця і старэйшых прадстаўнікоў сферы культуры).**

Узровень дасведчанасці вельмі нізкі.

**б. Прыклады, прыведзеныя МК, калі падпісанне канвенцыі прывяло да прыняцця адпаведных мер, якія ў іншым выпадку не былі б прадпрынятыя.**

Няма звестак

**в. Частата/ ступень згадвання канвенцыі ў афіцыйных стратэгічных дакументах ці заявах.**

Няма звестак

## 3.3. Папулярызацыя культуры/ Даследаванні/ Прафесійнае навучанне і пераемнасць/ Распаўсюд/ Сувязь/ Аблічбоўка

### 3.3.1. Агульныя ўмовы

**а. Колькасць, тып, памер і спіс інстытутаў, арганізацый і інш., уключаных у даследаванні ў сферы мастацтва.**

Наступныя актыўныя ў гэтай вобласці:

1. Нацыянальная акадэмія навук
2. Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў
3. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
4. Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі
5. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

6. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (былы беларускі ўніверсітэт, перамешчаны ў Вільнюс, Літва)
7. Інстытут Гётэ ў Мінску
8. Галерэя NOVA
9. Галерэя сучаснага мастацтва Ў

Апошнія тры галоўным чынам удзельнічаюць у дыскусіях па праблемах сучаснай культуры.

Большасць дзяржаўных музеяў праводзяць даследаванні, якія закранаюць у першую чаргу, іх уласныя калекцыі і тэмы, звязаныя з імі.

**б. Разуменне ўзроўню крытыцызму і дыскусій па пытаннях культуры і мастацтва сярод маладых спецыялістаў у сферы культуры (да 35 гадоў) праз метад правядзення абмежаваных, але прадстаўнічых інтэрв'ю.**

Ніводны з беларускіх дзяржаўных універсітэтаў не дае адукацыі па крытыцызме ў мастацтве. Ёсць філосафы і журналісты, якія пішуць пра мастацтва. Ёсць праект «На шляху да музея сучаснага мастацтва», мэтай якога з'яўляецца ўнясенне некаторых паляпшэнняў у гэтую сферу шляхам арганізацыі публічных лекцый. Хутка пачнецца новы праект Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільні (гэта дэ-факта беларускі універсітэт, які пераехаў у Літву з Мінска). «Крытыцызм у мастацтве» (серыя майстар-класаў па крытыцызму ў мастацтве, аналітыке ў культуры і інш.). Гэты курс майстар-класаў скіраваны на навучанне напісанню крытычных артыкулаў па пытаннях мастацтва.

### 3.3.2. Прафесійнае навучанне

**а. Узровень забяспечанасці і якасці прафесійнай адукацыі ў сферы мастацтва і культуры па інфармацыі МК і Міністэрства адукацыі.**

Дзяржаўная адукацыя ў сферы культуры і мастацтва заснаваная на ўстойлівай традыцыі. Сектары базавай, сярэдняй і вышэйшай адукацыі паспяхова функцыянуюць і забяспечваюць доступ да навучання ў сферы культуры і мастацтва.

Галоўная роля ў сістэме адукацыі ў сферы культуры належыць тром вышэйшым навучальным установам. Гэта: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі і Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў. Яны атрымалі статус важных культурных і даследчых цэнтраў. Такая магутная школа забяспечвае падрыхтоўку высокакваліфікаваных прафесіяналаў для ўсіх рэгіёнаў краіны[27].

**б. Колькасць вядомых міжнародных сувязяў у гэтай сферы, напр. паводле праграмы Erasmus.**

Плануецца навучанне выкладчыкаў выяўленчага мастацтва ў Маскве і мандаліны ў Кёльне; навучанне студэнтаў у сферы кіно і тэлебачання, кіназдымак, рэжысуры у тэатры і гранню на скрыпцы ў Маскве, а таксама рэстаўратараў у Празе.

### 3.3.3. Выкарыстанне інтэрнэту і забеспячэнне сувязі

**а. Любая даступная статыстыка па забяспечанасці і выкарыстанню Інтэрнэт-сувязі.**

Паводле нядаўніх даследаванняў кампаніі *Gemius у Беларусі* ў сакавіку 2012 года[28] было 4.29 мільёна інтэрнэт-карыстальнікаў. Большасць інтэрнэт-карыстальнікаў мае ўзрост ад 25 да 34 гадоў (30.27%). Тыя, каму ад 19 да 24 гадоў, складаюць 20.67% ад усіх карыстальнікаў. Няма інфармацыі пра значныя гендарныя адрозненні сярод інтэрнэт-карыстальнікаў. Працуючыя спецыялісты складаюць 25%, студэнты - 16%.

Паводле іншай крыніцы, інтэрнэт выкарыстоўваецца галоўным чынам у Мінску (33.6%). 73.51% беларускіх інтэрнэт-карыстальнікаў выкарыстоўваюць інтэрнэт штодня, 16.51% выкарыстоўваюць

[27] http://kultura.gov.by/temp/Culture2010.doc
[28] http://providers.by/2012/05/news/gemius-v-belarusi-okolo-43-millionov-polzovatelej-interneta/

яго 3-5 раз у тыдзень, 7.71% - 1-2 разы ў тыдзень, 2.27% - 1-3 разы ў месяц. 91.7% рэспандэнтаў маюць выхад у інтэрнэт у хаце, 25.9% - на працы, 4.8% у навучальных установах[29].

Паводле дадзеных Нацыянальнага камітэта па статыстыцы ў краіне налічваецца 6.8 мільёнаў інтэрнэт-карыстальнікаў[30].

**б. Кошт доступу ў інтэрнэт у параўнанні з прыбыткамі насельніцтва**

- **У хаце**
- **У інтэрнэт-кафэ**

Кошт інтэрнэт злучэння (24 г/сут) складае каля 60 000 бел. руб. (раней да сакавіка 2011 года яно каштавала 15 еўра, у наш час - 6 еўра).

Інтэрнэт-кафэ: 1 гадзіна каштуе 5 000-6 000 бел. руб. (0,5-0,6 еўра), 10 гадзін – 35 000 бел. руб. (3.4 еўра), 10 гадзін у начны час (з 24.00 да 7.00) – 16 000 бел. руб. (1.6 еўра).

Сярэдні заробак па краіне ў лістападзе 2011 года складаў 2 439.70 мільёна бел. руб. (250 еўра).

**в. Любая даступная статыстыка ці інфармацыя, якая сведчыць пра рост аб'ёмаў падлучэнняў.**

Паводле статыстычных дадзеных, прадстаўленых кампаніяй *Gemius у Беларусі* (глядзіце частку 3.3.3.а вышэй), колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў у сакавіку 2012 года была 4.29 мільёна чалавек, што на 17% больш, чым год таму.

**г. Любая даступная статыстыка, інфармацыя ці сведкі, якія адносяцца да «лічбавых раздзяленняў» (г.зн. адрозненні багатыя - бедныя, гарадскія - рэгіянальныя).**

За 2008, 2009 і 2010 гады да інтэрнэту быў падключаны шэраг рэгіянальных бібліятэк - 708, 162 і 181, адпаведна[31].

**д. Любая даступная статыстыка, ацэнкі ці даследаванні па выкарыстанні інтэрнэту ў сферы культуры і адпаведныя тэндэнцыі**

Няма звестак.

### 3.3.4. Праекты ў сферы лічбавых тэхналогій

**а. Колькасць і пералік сур'ёзных праектаў у сферы лічбавых тэхналогій, якія здзяйсняюцца пры падтрымцы ўлад (г.зн. стварэнне нацыянальнай лічбавай бібліятэкі, перавод у лічбавы фармат калекцый нацыянальных музеяў, віртуальныя выставы з выкарыстаннем нацыянальных калекцый ці архіваў і г.д.).**

Матэрыялы Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі (відэа, музычныя архівы) перакладаюцца ў лічбавы фармат. Завершана праца па аблічбоўцы фонду Нацыянальнай бібліятэкі. Кнігі, апублікаваныя пасля 2000 года, зараз даступныя ў лічбавым фармаце. Гэта сфера фінансуецца дзяржавай.

Група энтузіястаў вядзе працу па пераводзе ў лічбавы фармат запісаў фальклорнай музыкі.

---

[29] http://telegraf.by/2011/08/kolichestvo-internet-polzovatelei-v-belarusi-priblijaetsya-k-chetirem-millionam
[30] http://providers.by/2012/05/news/internet-auditoriya-belarusi-priblizhaetsya-k-otmetke-7-millionov-polzovatelej/
[31] Беларуская культура сёння. Гадавыагляд 2010. Мн.: БДУ культуры і мастацтваў. - 2011.

## 3.4. Доступ і адукацыя

### 3.4.1. Доступ

**а. Любыя паказальныя прыклады забеспячэння праграм развіцця ці дыскусій на афіцыйным узроўні ў сувязі з рознымі аспектамі доступу да культурнага жыцця (г.зн. пра правы ў сферы культуры, пра квіткі і кошты ўваходу на мерапрыемствы ў сферы культуры і мастацтва і інш.).**

Паводле Канстытуцыі РэспублікіБеларусь, дзяржава павінна забяспечваць агульнадаступнасць «культурных каштоўнасцяў».

**б. Пералік галоўных праблем па забеспячэнні доступу да культуры і мастацтва па меркаванні невялікай прадстаўнічай групы прафесіяналаў у сферы культуры. Гэтыя праблемы могуць уключаць адсутнасць забеспячэння, кошт, адсутнасць цікавасці, недастатковую рэкламную дзейнасць, пытанні гарадскога і рэгіянальнага дыстанцавання, непрадуманае планаванне на галоўных пляцоўках, нязручныя гадзіны працы і г. д.**

Нацыянальны «культурны прадукт» не прасоўваецца ў грамадстве і не мае міжнароднага прызнання і, як вынік, не атрымаў распаўсюджання. Напрыклад, руская літаратура больш папулярная ў Беларусі, чым беларуская літаратура. Замежныя артысты і пісьменнікі больш папулярныя ў Беларусі, чым беларускія. Колькасць інфармацыі, якая паступае з-за мяжы настолькі вялікая, што выцясняе беларускую культуру, хоць мерапрыемствы ў сферы культуры і мастацтва, якія не падвяргаюцца цэнзуры, лёгка даступныя для шырокай грамадскасці.

Няма недахопу ў забеспячэнні. Тэатр оперы і балета і драматычныя тэатры ўвесь час ладзяць пастаноўкі і заўсёды запоўненыя. Пасля рэстаўрацыі Тэатр оперы і балета стаў вельмі папулярным і ўжо правёў некалькі міжнародных мерапрыемстваў у гэтым сезоне. У Нацыянальным мастацкім музеі кожны месяц праходзяць 2-3 новыя выставы і 1-2 выставы кожныя 2 месяца праходзяць у Музеі сучаснага мастацтва. Галерэя Ў прадстаўляе шэраг выстаў і мерапрыемстваў, якія рэгулярна змяняюцца.

Кошт адрозніваецца ў залежнасці ад мерапрыемства і пакуль ён застаецца даступным. Квіткі на важныя мерапрыемствы прадаюцца за некалькі месяцаў да іх пачатку. Плата за ўваход у музеі невялікая (напрыклад, 1 еўра каштуе квіток у Нацыянальны мастацкі музей, 5 еўра – кошт экскурсіі з суправаджэннем гіда). Ёсць дні бясплатных наведванняў. Наведванне ўсіх галерэй мастацтва з'яўляецца бясплатным.

Хоць у сталіцы цікавасць да культурнай сферы даволі высокая, па краіне ў цэлым колькасць людзей, якія цікавяцца культурным жыццём, невялікая. Якая-небудзь статыстыка па наведванні культурных цэнтраў не даступная.

Маркетынг больш развіты ў тэатральнай і канцэртнай сферы, чым у сферы выяўленчага мастацтва, але не прасоўваецца далей звычайных публікацый у перыядычных выданнях.

Вядома, існуе розніца паміж гарадскім і рэгіянальным сектарам з найбольшай канцэнтрацыяй культурных падзей у сталіцы.

Гадзіны працы падаюцца адэкватнымі і здавальняючымі.

### 3.4.2. Адукацыя

**а. Доказы ўключэння некаторых відаў адукацыі ў сферы мастацтва ў школьны курс навучання.**

Да апошняга часу гадоў у школьнай праграме быў курс па сусветнай мастацкай культуры, але зараз яго няма. Ёсць два курса літаратуры: сусветная і беларуская літаратура. Праграма курсу па літаратуры не змянялася з савецкіх часоў.

**б. Прыклады любой дзейнасці ў сферы мастацтва ў рамках звычайнай агульнаадукацыйнай школы.**

Урокі спеваў і малявання ўваходзяць у школьную праграму да 6-га класа.

## 3.5. Наведванні і пашырэнне аўдыторыі

### 3.5.1. Статыстыка наведванняў

**а. Даступная статыстыка наведванняў мерапрыемстваў у сферы мастацтва і культуры, пачынаючы ад тэатраў і кіно да шэрагу культурных клубаў і інш.**

***Тэатры і музеі (дадзеныя на канец года)***

| | **2008** | **2009** | **2010** |
|---|---|---|---|
| Агульная колькасць тэатраў (прафесійных) | 28 | 27 | 27 |
| З якіх: | | | |
| Оперы і балета | 1 | 1 | 1 |
| Драмы і музыкі | 19 | 18 | 18 |
| Дзіцячых і моладзевых | 8 | 8 | 8 |
| Штогадовая наведвальнасць, мільёны | 1,907 | 1,931 | 1,981 |
| Колькасць музеяў | 152 | 155 | 158 |
| Штогадовая наведвальнасць, мільёны | 4,270 | 4,586 | 4,990 |

З іх у Мінску

| | 2008 | 2009 | 2010 |
|---|---|---|---|
| Колькасць тэатраў (прафесійных) | 11 | 10 | 10 |
| Штогадовая наведвальнасць, мільёны | 0,9487 | 0,933 | 0,9345 |
| Колькасць музеяў | 17 | 17 | 17 |
| Штогадовая наведвальнасць, мільёны | 1,020,1 | 1,063 | 1,2859 |

Статыстыка за 2011 на мамент падрыхтоўкі агляду не даступная.

**б. Доказы і прыклады тэндэнцый наведвальнасці, г.зн. назіраемы рост ці падзенне наведвальнасці розных мерапрыемстваў культурнага жыцця.**

Паводле дадзеных часткі 3.5.1.а., ёсць сведчанні росту наведвальнасці.

### 3.5.2. Пашырэнне аўдыторыі

**Статыстыка ці прыклады пашырэння аўдыторыі і праграм папулярызацыі, г.зн. у якасці складовай часткі працы тэатраў, музеяў, фэстаў і г.д., якая таксама можа дапамагчы ацаніць узровень распрацоўкі гэтай сферы.**

Установы культуры вядуць працу па папулярызацыі, але гэта дзейнасць не носіць сістэматычнага характару.

## 4. Асноўныя вынікі даследчага візіту РБМІР у краіну

Пачынаючы з кастрычніка 2011 г., РБМІР зрабіла шэраг навукова-даследчых візітаў у Азербайджан, Грузію, Беларусь, Малдову і Украіну, каб усталяваць кантакты з ключавымі зацікаўленымі бакамі Праграмы ў кожнай краіне і пачаць працэс даследавання канкрэтных напрамкаў палітыкі ў тых сферах культуры, якія павінны быць ўзмоцнены на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях. Палявыя работы ўключалі круглыя сталы з ключавымі прадстаўнікамі ўрада і грамадзянскай супольнасці, сустрэчы з ключавымі ўдзельнікамі культурнага сектару, прэзентацыі Праграмы і збор зыходных дадзеных для распрацоўкі базавых даследаванняў па пытаннях культурнай палітыкі ў краінах Усходняга партнёрства. Вынікі візітаў і наступныя даследаванні пакладзены ў аснову прапаноў па развіццю патэнцыялу ў пэўных прыярытэтных галінах, якія будуць ажыццяўляцца РБМІР у 2012 - сакавіку 2015 года.

Даследчы візіт РБМІР у Беларусь быў распачаты  ў лістападзе 2011 года групай экспертаў, у якую ўвайшлі спадар Лучана Глорыя, кіраўнік групы, спадарыня Таццяна Білецкая, эксперт па развіццю патэнцыялу, і спадарыня Алена Палівода, менеджэр па інфармацыі і камунікацыі, і Тэры Сандэл незалежны эксперт РБМІР.

Падчас візіту былі праведзены сустрэчы, інтэрв'ю, усталяваны кантакты з больш чым 40 прадстаўнікамі асноўных нацыянальных зацікаўленых структур па Культурнай праграме Усходняга партнёрства: прадстаўнікамі дзяржаўнага і прыватнага сектара, арганізацый грамадзянскай супольнасці, а таксама дэлегацыі ЕС у краіне і донарскімі ўстановамі, якія дзейнічаюць у Беларусі.

Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі забяспечыла РБМІР істотную падтрымку ва ўсталяванні афіцыйных кантактаў з Міністэрствам культуры Беларусі, што заняло шмат часу. Усталяванне кантактаў з культурнымі дзеячамі грамадзянскай супольнасці краіны таксама заняло больш часу, чым чакалася.

Круглы стол па запатрабаваннях і прыярытэтах палітычных рэформаў у галіне культуры з удзелам прадстаўнікоў больш чым 30 ключавых зацікаўленых структур, які адбыўся  у Мінску, стаў галоўнай падзеяй візіту. Сустаршынёй круглага стала быў кіраўнік аддзела міжнародных сувязей Міністэрства культуры Міхаіл Кажура. Міністэрства была прадстаўлена яшчэ трыма супрацоўнікамі, якія актыўна ўдзельнічалі ў абмене думкамі.

Міністэрства культуры падкрэсліла важнасць разумення беларускай культуры як часткі сусветнай і еўрапейскай культуры і выказала ўдзячнасць за дзейнасць ЕС у галіне культуры і развіцця міжнароднага культурнага супрацоўніцтва. Міністэрства таксама выказала надзею на больш глыбокае ўзаемадзеянне з ЕС у гэтай галіне.

Усе ўдзельнікі круглага стала пагадзіліся з эфектыўнасцю такога інструмента для запуску і далейшага развіцця партнёрства паміж дзяржавай і прыватнымі структурамі ў культурным сектары Беларусі.

РБМІР прадставіў праграму Усходняга партнёрства па пытаннях культуры, праінфармаваў пра яе мэты, задачы і асноўныя кампаненты. Асаблівая ўвага была нададзена тлумачэнню метадаў і рабочых інструментаў РБМІР, якія будуць выкарыстоўвацца ў ходзе рэалізацыі праекта, уключаючы:

- Даследчы працэс у выглядзе *Параўнальных даследаванняў і дыягностыкі культурнай палітыкі;*
- Рэгіянальныя мерапрыемствы па развіццю патэнцыялу, менавіта С*емінары і практыкумы па абмену вопытам у культурнай палітыцы*, якія будуць арганізаваны РБМІРу 2013-2014 гадах ;
- Падтрымка ў рэалізацыі праектаў, якія атрымліваюць гранты ў рамках праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры;
- Камунікацыі і развіццё сеткі кантактаў, якія забяспечаць інфарматыўнасць і распаўсюджванне вынікаў Праграмы.

Удзельнікі былі таксама праінфармаваны аб магчымасці для органаў дзяржаўнай улады атрымаць спецыяльную, арыентаваную на канкрэтную краіну, тэхнічную дапамогу па пытаннях культурнай палітыкі і прававых рэформаў у рамках мерапрыемства: *Тэхнічная дапамога ўрадам Усходняга партнёрства* РБМІР.

Нацыянальным зацікаўленым структурам было прапанавана выказаць сваю гатоўнасць прыняць удзел у дзейнасці *Кансультатыўнага камітэту праграмы Усходняга партнёрства па пытаннях культуры.*

Спадар Тэры Сандэл, эксперт РБМІР, прадставіў аўдыторыі асноўныя вынікі справаздачы аб аказанні падтрымкі ІЕПД Усходняга рэгіянальнага супрацоўніцтва ў галіне культуры (Ацэнка запатрабаванняў, прадстаўленая ў ЕС у верасні 2008 года). Нягледзячы на тое, што Ацэнка запатрабаванняў, праведзеная ў 2008 годзе, не распаўсюджвалася на сітуацыю ў Беларусі, прэзентацыя дапамагла ўдзельнікам круглага стала лепш зразумець вытокі праграмы УП па пытаннях культуры.

Падзяляючы тое самае меркаванне аб асноўных асаблівасцях культуры і культурных падзеях у краіне за апошнія тры-пяць гадоў, прадстаўнікі культурнага сектара Беларусі ўзгадалі шэраг рэчаў, якія палепшыліся ці пагоршыліся або сталі новым пытаннямі, якія выклікаюць заклапочанасць у галіне культуры ці нейкім яе суб-сектары на нацыянальным або мясцовым (муніцыпальным) узроўні.

Былі згаданы наступныя моцныя бакі і пазітыўныя фактары, у прыватнасці:

- Існуючы патэнцыял чалавечага рэсурса, які спалучае ў сабе прафесіяналізм і інтэлектуальны ўзровень;
- Паглыбленне культурнага супрацоўніцтва, якое ўключае ў сябе сумесныя праекты і міжнароднае партнёрства, асабліва з ЕС, у галіне культуры і мастацтва.

У той жа час, былі названы наступныя негатыўныя фактары і праблемы:

- Адсутнасць у сферы культуры прынцыпаў дзяржаўнага кіравання, заснаваных на дэмакратычным удзеле грамадзянскай супольнасці і адкрытым дыялогу;
- Празмернае ўмяшанне дзяржавы ў культурныя мерапрыемствы, якое падаўляе свабоду культурнага самавыяўлення і творчасці;
- Заканадаўчыя абмежаванні на правядзенне культурных мерапрыемстваў і адміністрацыйныя бар'еры, якія перашкаджаюць развіццю недзяржаўнага сектара культуры, а таксама ўзнікненню ініцыятыў «знізу»;
- Недахоп прафесійных кадраў.

У ходзе абмеркавання былі закрануты асноўныя патрэбы і прыярытэты рэфармавання і ўмацавання культурнага сектара, а таксама рэгіянальныя і нацыянальныя ініцыятывы і розныя праграмы ЕС і міжнародныя праграмы ў такіх галінах, як культура, адукацыя і развіццё асобы.

У дачыненні да асноўных пытанняў, якія павінны быць разгледжаны ў рамках культурнага заканадаўства і палітыкі ў галіне культуры дзеля павышэння гатоўнасці сектара да мадэрнізацыі і пазітыўных зменаў, нацыянальнымі зацікаўленымі структурамі былі названы наступныя пытанні:

- Стварэнне прававых норм для культурнай дзейнасці і развіцця няўрадавага культурнага сектара на аснове правоў і свабод;
- Забеспячэнне свабоднага партнёрства і дыялогу культур, у прыватнасці, паміж дзяржаўным і грамадскім сектарам, урадавымі і няўрадавымі ўстановамі культуры; міжнароднага культурнага супрацоўніцтва з удзелам міжнародных фондаў і краін Усходняга партнёрства;
- Увядзенне новых стандартаў і падыходаў да дзяржаўнага кіравання культурным сектарам, заснаванага на прынцыпах дэмакратыі, правоў і свабод у галіне культуры; забеспячэнне партнёрства паміж урадам і грамадскім сектарам са спрошчаным доступам да інфармацыі і ўдзелам грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў;

- Увядзенне падатковых ільгот і фіскальных стымулаў для заахвочвання інвестыцый у сектар культуры і стварэнне ўмоў для ўстойлівага функцыянавання дзяржаўных і няўрадавых установ культуры і асобных дзеячаў.

Удзельнікі круглага стала, рабочых сустрэч і інтэрв'ю адзначалі важнасць абмену вопытам і супрацоўніцтва з установамі ЕС, а таксама развіцця культурнага дыялогу і абмену думкамі для далейшага развіцця сферы культуры ў Беларусі.

Міністэрства культуры таксама звярнулася за пэўнай тэхнічнай дапамогай, якая прадастаўляецца ў рамках праграмы, а менавіта за экспертнай падтрымкай даследаванняў ролі культуры ў сацыяльна-эканамічным развіцці і развіцці адпаведных суб-сектарных стратэгій.

Суб'екты культуры, якія прадстаўляюць сучаснае незалежнае візуальнае мастацтва Беларусі, таксама адзначылі неабходнасць падрыхтоўкі «універсальных мэнэджараў», як адну з асабліва важных патрэб у галіне культуры Беларусі.

Пасля даследчага візіту РБМІР у краіну ўдзельнікам круглага стала і ўсім нацыянальным зацікаўленым структурам, з якімі ў ходзе візіту былі праведзены сустрэчы, было прапанавана ўнесці свой уклад у SWOT-аналіз нацыянальнага сектара культуры і культурнай палітыкі шляхам запаўнення он-лайн апытальнікаў. Падрабязная інфармацыя аб SWOT-ацэнцы прадстаўлена ў Дадатку 1 да справаздачы.

Каб атрымаць больш падрабязную інфармацыю аб прыярытэтных патрэбах культурнага сектара Беларусі і іншых краін-партнёраў, а таксама аб умовах поспеху Праграмы, глядзіце, калі ласка, Рэгіянальную даследчую справаздачу (раздзел 3: *Асноўныя вынікі даследчага візіту РБМІР ў шэсць краін УП*, Дадатак3: *SWOT-ацэнка нацыянальнымі зацікаўленымі структурамі культурнай палітыкі і прыярытэтных патрэб культурнага сектара краін УП*).

## Спісы крыніц

### Бібліяграфія друкаваных/ вэб-публікацый па пытаннях культурнай палітыкі і культурнага сектара Беларусі


1. A report on the condition of NGOs and independent culture in Belarus (http://kulturaenter.pl/pliki/pdf/Bialorus_E.pdf)
2. Culture and Change in Belarus. Report prepared by Yael Ohana. European Cultural Foundation and German Marshall Fund of the United States, East European Reflection Group (EE RG). Identifying Cultural Actors of Change in Belarus, Ukraine and Moldova: http://www.labforculture.org/en/directory/contents/region-in-focus/belarus/culture-and-change-in-belarus
3. Interview with Igor Logvinov. kulturaenter.pl/дзяржава-пісьменнік-публікацыя-игор/2011/10/ Abstracts: 2Н//69648(039)*2Н//74471(039)
4. Lectures on cultural policy by Matskevich Vladimir http://methodology.by/?p=661
5. Vitali Silitski and Jan Zaprudnik (editors): Historical Dictionary of Belarus (The Scarecrow Press, 2007)
6. Беларусь. XXI век : [V Белорусский Международный медиафорум "Партнерство во имя будущего" (8—11 июня 2010 г.) / составители: В. В. Калистратова, Е. И. Семашко]. - Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2010.
7. В соцветии народов и культур : [буклет / Государственное учреждение "Центр культуры "Витебск". - Витебск : [б. и.], 2009.
8. Валер Булгаков (редактор): Беларусь: ни Европа, ни Россия. Мнения белорусских элит (ARCHE, Warsaw, 2006)
9. Вып. 19: Ноосферная экономика в начале XXI века: наука, образование, инновации, культура / [составитель В. Г. Гавриленко. - 2010.
10. Культура и искусство [Электронный ресурс] : сборник нормативных правовых актов законодательства Республики Беларусь и международные правовые акты / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. - Минск : НЦПИ, [2009?].
11. Культура, наука, образование в современном мире : материалы V Международной научной конференции, [посвященные 60-летию УО "Гродненский государственный аграрный университет" / редколлегия: Л. Л. Мельникова и др.]. - Гродно : ГГАУ, 2011.
12. Матвейчук В.Ф. Приоритеты культуры: быть востребованной социумом. http://pu.by/iss/n28/MATVEICHUK_28.pdf
13. Мацкевич, В. В. (род. 1956). Переоценка ценностей в культуре и истории Беларуси / Владимир Мацкевич. - Минск : И.П. Логвинов, 2010.
14. Моральное наследие в динамике культуры: проблема статуса и механизмов трансляции : диссертация на соискание ученой степени доктора философских наук : 09.00.05 : защищена 15.11.07 : утверждена 20.02.08 / Лаптёнок Александр Сергеевич ; Учреждение образования "Белорусский государственный университет". – Минск, 2007.
15. Приоритет государства — развитие культуры : библиографический список литературы / Учреждение культуры "Могилевская областная библиотека им. В. И. Ленина", Информационно-справочный отдел. - Могилев : Могилевская областная библиотека, 2011.
16. Социально-психологические проблемы современного общества и человека: пути решения : материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 20—21 октября 2011 г. / [редколлегия: Г. А. Качан, С. Д. Матюшкова]. - Витебск : ВГУ, 2011.
17. Татары в Беларуси и их культура (XIV-XVII века) : диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук : защищена 08.04.05 : утверждена 22.06.05 : 07.00.02 / Канапацкая Зорина Ибрагимовна. – Минск, 2005.
18. Шадурский, В. Внешняя культурная политика Беларуси: поиск оптимальной модели / В. Шадурский // Материалы VIII Междунар. науч. конф., посвящ. 88-летию Белорус. гос. ун-та. Минск, 30 октября 2009 г. / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. — Минск: БГУ, 2009. http://www.fir.bsu.by/chairs/ir/publications_ir/shadursky/shadursky_2009_BMW.pdf
19. Язык. Общество. Медицина : материалы X Республиканской научно-практической студенческой конференции, посвященной 150-летию со дня рождения А. П.Чехова. Материалы VII научно-практического семинара для преподавателей "Технологии обучения языкам и проблемы преподавания в иноязычной аудитории" / [редколлегия: А. А.

Мельникова (ответственный редактор), Н. А. Мишонкина, В. И. Воронец]. - Гродно : ГрГМУ, 2011.

20. Акудовiч, В. В. (нар. 1950). Архiпелаг Беларусь : кнiга дыялогаў / Валянцiн Акудовiч. - Мiнск : Галiяфы, 2010.
21. Беларуская культура сёння, 2008 : гадавы агляд / Мiнiстэрства культуры Рэспублiкi Беларусь, Беларускi дзяржаўны унiверсiтэт культуры i мастацтваў. - : БДУКiМ, 2009.
22. Беларуская культура сення, 2009 : гадавы агляд / Мiнiстэрства культуры Рэспублiкi Беларусь, Беларускi дзяржаўны унiверсiтэт культуры i мастацтваў. - Мiнск : БДУКiМ, 2010.
23. Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / I. В. Анцiпенка [i iнш.]; пад агул. рэд. Т. I. Стружэцкага; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Iн-т культуры Беларусi. — Мiнск : БДУ культуры i мастацтваў, 2011.
24. Дзяржаўная палiтыка Беларусi ў галiне прафесiйнай мастацкай культуры (1985-2000 гг.) : аўтарэферат дысертацыi на суiсканне вучонай ступенi кандыдата гiстарычных навук : 07.00.02 : 23.09.2005 / Папко Вольга Мiкалаеўна ; Нацыянальная акадэмiя навук Беларусi, Дзяржаўная навуковая ўстанова Iнстытут гiсторыi. – Мiнск, 2005.
25. Iнстытут беларускай культуры, 1922—1928 : дакументы i матэрыялы / Нацыянальная акадэмiя навук Беларусi, Iнстытут гiсторыi, Дэпартамент па архiвах i справаводстве Мiнiстэрства юстыцыi Рэспублiкi Беларусь, Нацыянальны архiў Рэспублiкi Беларусь. - Мiнск : Беларуская навука, 2011.
26. Культурная спадчына грэка-каталiцкай царквы ў Беларусi ў кантэксце дыхатамii "Усход — Захад" : дысертацыя на суiсканне вучонай ступенi кандыдата культуралогii : 24.00.01 : абаронена 26.11.09 : зацверджана 03.03.10 / Суша Аляксандр Аляксандравiч ; навуковы кiраўнiк Смолiк Аляксандр Iванавiч ; Установа адукацыi "Беларускi дзяржаўны унiверсiтэт культуры i мастацтваў". – Мiнск, 2009.
27. Навукова-метадычнае i iнфармацыйнае суправаджэнне падрыхтоўкi кадраў для сферы культуры i мастацтва : матэрыялы навукова-метадычнай канферэнцыi (3 лютага 2010 года) / [рэдкалегiя: Р. А. Ровiна (адказны рэдактар) i iнш.]. - Мiнск : БДУКiМ, 2010.
28. Удзел Беларусi ў дзейнасцi ЮНЕСКА (1984 - 2001 гг.) : дысертацыя на атрыманне вучонай ступенi кандыдата гiстарычных навук : 07.00.15 : абаронена 22.02.2007 : зацверджана 16.05.2007 / Раманоўскi Раман Генадзевiч ; навуковы кiраўнiк Снапкоўскi У. Е. ; Беларускi дзяржаўны унiверсiтэт. – Мiнск, 2006.

## Web-pages

www.34mag.net
www.abiturient.by
http://another.by
http://arche.by/
www.artaktivist.org
http://artcode.by/2012
http://artkurator.com
http://belapan.by
www.belarus.by/ru/about-belarus/culture
www.belaruspartisan.org
http://belintellectuals.eu/about/
http://belstat.gov.by/homep/en
http://bo-promo.com
www.belta.by
www.belta.by/ru/all_news/culture
www.budzma.org
http://concert.by
www.dziejaslou.by
www.en.ngo.by
www.gazetaby.com
http://gender-route.org
http://generation.by
www.globus.tut.by
www.hoteleurope.by
http://journal-parter.blog.tut.by
www.kamunikat.org
http://knihi.com/
www.kultura.by
www.kultura.gov.by
www.kyky.org
www.lit-bel.org
www.main.lim.by
http://methodology.by
http://mova.na.by
http://n-europe.eu
http://naviny.by/rubrics/culture
www.nesvizh.by
http://novagallery.by
http://pomniki.budzma.org
www.prastora.org
http://prasvet.com
www.pravo.by
http://pravoby.info
www.radzima.org
www.rescue01.gov.by
www.svaboda.org
www.telegraf.by
http://topos.ehu.lt
http://vak.org.by
www.ygallery.by

# Дадатак 1. SWOT-ацэнка нацыянальнымі зацікаўленымі структурамі культурнай палітыкі і прыярытэтных патрэб культурнага сектара краін УП

*Глядзіце арыгінальны тэкст дакладу на англійскай мове для гэтага дадатку*

## Дадатак2. Вытокі - Беларусь у гістарычным кантэксце[32]

Краіны Усходняга партнёрства менш вядомыя і таму менш зразумелыя для дзяржаў-членаў ЕС. У выпадку Беларусі гэта сапраўды так, у сувязі з недасведчанасцю і недахопам ведаў і з адмовай заходніх СМІ ад агучвання навін з краіны «з апошняй дыктатурай у Еўропе».

На самай справе Беларусь з'яўляецца складанай, разнастайнай, цікавай краінай, размешчанай у самым геаграфічным цэнтры Еўропы. Яе гісторыя ў XX стагоддзі, галоўным чынам непазнаная і, магчыма, больш трагічная, чым гісторыя любой іншай краіны ў Еўропе. З моманту здабыцця незалежнасці ў 1991 годзе яна набыла нечаканую моц і, адначова, станоўчую ўнікальнасць, якая ніяк не звязана з ўнікальнасцю эксцэнтрычнай палітычнай сістэмы з унітарным уладкаваннем.

Той факт, што гэтая палітычная сістэма не адпавядае еўрапейскім нормам і стандартам, меў наступствы, якія неапраўдана і несправядліва паўплывалі на імідж і міжнародныя магчымасці кваліфікаваных спецыялістаў і малодшай часткі яе насельніцтва, вартага параўнання з лепшымі ў Еўропе. Гэта таксама сказіла як яе развіццё, так і знешняе ўспрыняцце яе сучаснай культуры. Гісторыя краіны сфармавала адукаваны клас, у асноўным кансерватыўных і сур'ёзных людзей, для якіх каштоўнасці, стабільны прагрэс і прафесіяналізм з'яўляюцца галоўнымі, і гэта дадае парадоксу ў яе цяперашняе становішча «ізгоя» сярод еўрапейскіх дзяржаў.

Як і ў іншых краінах Усходняга партнёрства, існуе шмат спецыфічных фактараў, якія перашкаджаюць разуменню гэтай краіны. Яе гісторыя была даволі складанай і ўскладняецца таксама тэрміналогіяй. Існавала блытаніна нават з назвай – Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, Беларусія, а цяпер Беларусь, што мае сэнс  "Белая Русь", а не "Белая Расія", хоць нават у гэтым кантэксце існуюць розныя погляды на паходжанне прыметніка "белы».  Тэрмін «Белая Расія» (напрыклад, Weissrussland як краіну яшчэ называюць у Германіі) надае удвая больш блытаніны ў тым, што «Белая Русь» нават тады, калі яна была часткай Расійскай Імперыі, ніколі не была «рускай» у сучасным сэнсе гэтага слова, не была звязана з «белымі» часоў расійскай рэвалюцыі.

Адпраўной кропкай для разумення сучаснай Беларусі з'яўляецца яе цэнтральнае размяшчэнне ў Еўропе і адкрытасць геаграфічнага ландшафту, якія на працягу ўсёй гісторыі рабілі яе скрыжаваннем шляхоў захопніцкіх войскаў з Еўропы. Геаграфія і геапалітыка сёння па-ранейшаму з'яўляюцца ключавымі фактарамі ў фармаванні ўнутранай палітыкі Беларусі і міжнародных адносін.

З гістарычнага пункту гледжання Беларусь апынулася заціснутай паміж двума экспансіянісцкімі суседзямі – Польшчай і Расіяй, якія пастаянна змагаліся за яе. Да часу незалежнасці яе гісторыя была «страчана» і выглядала як шэраг падпарадкаваных сюжэтаў і аповедаў у рамках гісторыі суседзяў. Нягледзячы на тое, што Польшча і Расія мелі вялікі ўплыў на культурнае, рэлігійнае і моўнае развіццё Беларусі, краіна мае сваю багатую культурную спадчыну (нягледзячы на велізарныя разбурэнні і страты), што стварае базу для развіцця асаблівай, хоць і супярэчлівай нацыянальнай  ідэнтычнасці, якая, у сваю чаргу, павольна спрые росту рэальнай палітычнай і інтэлектуальнай незалежнасці.

Беларусь не мае выхаду да мора, яе суседзямі з'яўляюцца Расія на поўначы і ўсходзе, Украіна на поўдні, Польшча на захадзе, Літва на паўночным захадзе, Латвія  на поўначы. Гэта пераважна раўнінная краіна невялікіх узвышшаў і нізінаў, каля 40% яе тэрыторыі займаюць лясы, яна добра абводнена рэкамі, асабліва азёрамі, колькасць якіх перавышае 11 тысяч. Экалагічна гэта адзін з самых некранутых рэгіёнаў Еўропы, што, як правіла, не згадваецца з прычыны міжнароднага ўсведамлення сур'ёзных наступстваў Чарнобыльскай катастрофы ў раёнах паўднёвай часткі Беларусі.

Па дадзеных перапісу 2009 года, насельніцтва Беларусі складае 9,5 мільёнаў чалавек. Найбольш значнай зменай у параўнанні з перапісам насельніцтва 1999 года з'яўляецца рэзкае зніжэнне этнічных меншасцяў, напрыклад, колькасць рускіх знізілася на трэць: з 1,1 мільёна да 785 тысяч,

[32] Дадзены падзел прызначаны ў якасці ўвядзенне для людзей, не знаёмых з Беларуссю і яе гістарычнае развіццём. Ён быў напісаны Тэры Сандэлам на аснове яго папярэдніх работ і даследаванняў.

колькасць палякаў - на чвэрць: з 396 тысяч да 295-ці і ўкраінцаў – на трэць: з 237 тысяч да 159-ці. Гэта дазваляе выказаць меркаванне пра тэндэнцыі да монаэтнізму, але, верагодна, гэта магчыма патлумачыць схільнасцю людзей самаідэнтыфікавацца часткай тытульнай нацыі, а не меншасцю. Акрамя таго, другім важным вынікам перапісу 2009 года з'яўляеццца відавочна рэзкае зніжэнне колькасці людзей, якія вызначаюць беларускую мову як «родную мову», але пераход ад 73,6% у 1999 годзе да 53,2% у 2009 годзе можа быць у значнай меры звязаны з рознай фармулёўкай гэтага пытання ў двух перапісах.

Паходжанне беларусаў з'яўляецца неадназначным. Тэорыя, што яны маюць чыста славянскія карані, якая асабліва падтрымлівалася ў савецкія часы, аспрэчваецца больш уплывовай тэорыяй, якая даказвае, што яны ўяўлялі сабой сінтэз балтаў і славян, або былі павольна славінізаваныя з балтаў з 8-га па 13-е стагоддзе, і менавіта гэта стварыла кантэкст для далейшага развіцця беларускай мовы і нацыі. На працягу ранняга перыяду на фармаванне гісторыі Беларусі ўплывалі дзве галоўныя ракі – Днепр, які цячэ ў напрамку Чорнага мора і ў той час забяспечваў сувязь з Візантыяй (знакаміты «Шлях з варагаў у грэкі» праз Кіеў), і Заходняя Дзвіна, якая злучае з Балтыйскім морам і гарадамі паўночнай Германіі. Сетка водных шляхоў забяспечвала сувязь з Польшчай на захадзе, а пазней і з Масковіяй на ўсходзе.

Спачатку палітычная гісторыя Беларусі была звязана з гісторыяй Кіеўскай Русі, з яе экспансіяніcцкімі памкненнямі і суперніцтвам, у тым ліку з Ноўгарадам. Горад Полацак (Полацк) стаў галоўным сярэднявечным палітычным цэнтрам беларускай тэрыторыі і ўспрымаецца беларускімі нацыяналістамі як сімвалічная крыніца першых імкненняў да незалежнасці Беларусі. Хрысціянства было прынята неўзабаве пасля яго прыняцця ў Кіеве, і ўжо ў 992 годзе Полацак (Полацк) быў епіскапствам. Моцныя дахрысьціянскія традыцыі, аднак, былі відавочныя яшчэ ў 19 стагоддзі. Полацак (Полацк) прыйшоў у заняпад у канцы 12 стагоддзя, з'явіліся іншыя палітычныя цэнтры, такія як княства Тураўскаге і Пінскае, а затым і Наваградскае. Наваградак знаходзіўся ў пастаянным канфлікце з нямецкімі рыцарамі, якія сталі дамінаваць у Прыбалтыцы, да таго ж іх уладзе над балтыйскімі і славянскімі землямі спрыяла разбурэнне Кіева мангола-татарамі ў 1240 годзе.

Наваградак пазней стаў сталіцай літоўскага князя Міндоўга (Міндаўгаса), літоўскі[33] герцаг, які аб'яднаў усходнія літоўскія і заходнія беларускія землі ў Вялікае Княства Літоўскае. Так як большасць насельніцтва Літвы была непісьменнай і да 1386 года паганскай, дзяржава кансалідуецца вакол праваслаўнага хрысціянства і беларуская мова становіцца афіцыйнай дзяржаўнай мовай, што працягвалася да 1697 года.[34]

Вялікае Княства Літоўскае пашыраецца ў 14 стагоддзі і становіцца Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, што адлюстроўвае яго велізарную тэрыторыю, якая распасціралася ад Балтыйскага да Чорнага мора. Сталіца гэтай імперыі перамясцілася з Наваградка ў сучасную Вільню ў 1323 годзе. У 1385 годзе быў заключаны дынастычны саюз паміж Вялікім Княствам і Польшчай, вялікі князь Ягайла стаў таксама і каралём Польшчы, ажаніўшыся на польскай каралеве. Таму ён быў адначасова і паралельна Вялікім князем Княства і Польскім каралем. Ён перайшоў у каталіцызм, які стаў рэлігіяй літоўцаў, у той час як насельніцтва беларускіх і ўкраінскіх тэрыторый Вялікага Княства прадоўжылі следаваць візантыйскаму абраду.

Каталіцызм, тым не менш, пачынае пранікаць на гэтыя тэрыторыі ў выніку льгот, якія прадастаўляюцца каталікам у Вялікім Княстве, сацыяльная эліта Беларусі (як і «правабярэжнай» Украіны) далучылася да каталіцтва і польскай культуры. Гэтая тэндэнцыя ўмацавалася ў выніку Люблінскай уніі 1569 года, якаяператварыла дынастычны саюз 1385 года ў палітычны саюз Вялікага Княства і Царства Польскага, і прывяла да стварэння новай Рэчы Паспалітай у якасці

[33] Частка тэрміналагічнай блытаніны, якая дадала гістарычнай складанасці Беларусі і выклікала некаторую напружанасць, тычыцца выкарыстання тэрміна "Літва". У сучаснай літоўскай мове, "Літва" называецца Lietuva. Як будзе відаць ніжэй, Вялікае княства Літоўскае было адным з найбуйнейшых дзяржаў у Еўропе, якая доўжылася дэ-факта прыкладна з 12 стагоддзя да «трэцяга падзелу» у 1795 годзе. Нягледзячы на назву і яго сучасныя канатацыі, Вялікага княства Літоўскага на самай справе складалася з тэрыторыі і групы насельніцтва, якія сёння з'яўляюцца часткамі сучаснай Беларусі, Польшчы, Літвы, Украіны, Расіі, Латвіі, Эстоніі і Малдовы.

[34] Тады яна, у выніку паланізацыі, якая вялася праз шэраг пагадненняў і саюзаў між Вялікім Княствам і Польскай каронай, была заменена польскай мовай. Гл. ніжэй.

федэратыўнай дзяржавы. Як вынік, беларускія і ўкраінскія землі трапілі пад польскі ўплыў, і таму паланізацыя і акаталічванне беларускай і літоўскай шляхты значна павялічыліся. Аднак, Вялікаму Княству ўдалося захаваць свае пазіцыі, у тым ліку працягваць выкарыстанне беларускай мовы для афіцыйных зносін.

Фенамен беларускай шляхты, якая прымала апалячванне, таму што яно давала палітычныя і іншыя перавагі, у той час як простыя людзі заставаліся вернымі візантыйскаму абраду усходняга хрысціянства , прывёў да рэлігійнага антаганізму і канфесійнай складанасці, якая па гэты дзень аказвае ўплыў на сучасную Беларусь.

Брэсцкая унія (1596) прывяла да акта афіцыйнага «аб'яднання» Візантыйскай праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, якім Праваслаўная Царква была аб'яўлена ўніяцкай. Уніяты мелі сваю іерархію, напачатку захоўвалі візантыйскі абрад і царкоўнаславянскую мову, але прынялі вяршэнства папы Рымскага і некаторыя каталіцкія дагматы. Многія праваслаўныя, аднак, адмовіліся прызнаць унію, што прывяло да расколу ў грамадстве і значнаму гвалту.

Нягледзячы на тое, што іншыя рэлігіі не былі забаронены, з'яўленне ўніяцкай царквы, як дэ-факта «дзяржаўнай царквы», стварыла вялікую напружанасць, якая выявілася не толькі ў шырокай палемічнай дыскусіі ў літаратуры, але і ў кровапраліцці. Каталіцызм і каталіцкі ўплыў усё больш і больш стаў атаясамлівацца з польскасцю, у той час як праваслаўе пачало атаясамлівалася з Масковіяй і рускай мовай. Рускія цары абвясцілі сябе «Трэцім Рымам», а пасля выкарысталі гэта, каб апраўдаць імперскую экспансію на захад, якая пачалася з серыі войнаў у 16 стагоддзі, каб апраўдаць свае прэтэнзіі на «вызваленне» праваслаўных.

Нягледзячы на войны з Масковіяй, 16 стагоддзе адзначылася росквітам гандлю і эканамічнай дзейнасці, асабліва ў рамках самакіравання горадоў, а таксама «Залатым векам» беларускай культурнай дзейнасці. Рух Рэфармацыі і Контррэфармацыі аказаў глыбокі ўплыў на беларускую культуру і рэлігійныя падзеі, у тым ліку, напрыклад, на інтэлектуальную палеміку і выдавецкую дзейнасць, прычым апошняя асабліва захавалася ў гісторыі, дзякуючы Францыску Скарыне, які пераклаў і апублікаваў Біблію на старабеларускай мове.

У 17 стагоддзі Рэч Паспалітая пачала прыходзіць у заняпад з-за знясільваючых унутраных супярэчнасцей. Пачалося ўмяшанне Масквы ў палітычнае жыццё Рэчы Паспалітай. Яно завяршылася са знікненнем Рэчы Паспалітай з карты Еўропы праз пагадненне Кацярыны Вялікай з Прусіяй і Аўстрыяй аб трох падзелах Рэчы Паспалітай у 1772, 1793 і 1795 гг. Уся Беларусь стала часткай Расійскай імперыі, за выключэннем невялікай тэрыторыі на захадзе, якая падпарадкоўвалася Прусіі.

Разам з праваслаўна-каталіцкага-уніяцкім веравызнання, іншыя рэлігіі таксама былі прадстаўлены ў Вялікім княстве Літоўскам і Рэчы Паспалітай, менавіта літоўскія габрэі. Габрэі былі вынікам, верагодна, двух міграцый, адна з якіх адбылася ў 8-м стагоддзі. Габрэйскае насельніцтва было значным як колькасна, так і прыкметнай роллю, якую яны ігралі. Іх пазіцыя чаргавалася паміж перыядамі, калі яны мелі асаблівыя прывілеі, былі свабоднымі і былі набліжаны непасрэдна да манархіі, і перыядамі, дзе яны сутыкаліся з пераследам, у тым ліку выгнанне з 1495 па 1503, калі ім было дазволена вярнуцца. Па трэцім падзеле у 1795 годзе яны сталі часткай Расейскай Імперыі і маглі афіцыйна жыць толькі ў межах «зоны аселасці», азначанай указам Кацярыны Вялікай, ў частцы Расейскай Імперыі на старой мяжы Рэчы Паспалітай.

Яшчэ адной значнай групай былі літоўскія[35] татары, якія прыбылі ў 14 стагоддзі ў двух міграцыях, першая група шукала рэлігійнага прытулку для захавання іх шаманскай рэлігіі, другая група мусульман пазней была запрошана Вітаўтасам Вялікім князем. Была выказана здагадка, што ў канцы 16-га стагоддзя ў Рэчы Паспалітай пражывала 200 тысяч татар. Хоць яны заставаліся мусульманамі, праходзіла асіміляцыя да беларускага, польскага, літоўскага і ўкраінскага насельніцтва, у асноўным за кошт апалячвання. Тыя, хто прыняў беларускую мову працягвалі карыстацца арабскім алфавітам да 1930 года. Сёння каля дзесяці - пятнаццаці тысяч татар жывуць на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай.

[35] Літоўскія татары – гістарычная назва беларускіх татар.

У складзе Расійскай імперыі Беларусь падвяргалася русіфікацыі, а ўніяцкая царква, да якой у той час належала, праўдападобна, каля трох чвэрцяў насельніцтва, падвяргалася прыцясненню. Беларуская мова разглядалася як дыялект рускай мовы, польская мова захоўвала свае пазіцыі да польскага паўстання 1830 года, якое мела вялікую падтрымку на беларускай тэрыторыі. У 1836 годзе руская мова была абвешчана адзінай мовай навучання, а польская мова забаронена.

У 1839 годзе ўніяцкую царкву «адмянілі», а яе прыхільнікаў гвалтоўна навярнулі ў рускае праваслаўе. У 1840 годзе тэрміны Літва і Беларусь (маецца на ўвазе ўсходняя частка сучаснай Беларусі) былі забаронены і беларускія тэрыторыі сталі называць губернямі. Апазіцыя русіфікацыі была адлюстравана ў падтрымцы беларусамі польскага паўстання 1863 года, якое прывяло да смяротных пакаранняў, а больш за 12 тысяч беларусаў былі сасланы ў Сібір. Але ў канчатковым выніку паўстанне прывяло да ўзмацнення русіфікацыі і далейшай барацьбы з польскім уплывам. Бесперапынныя нацыяналістычныя прэтэнзіі рускіх і палякаў да Беларусі, адлюстраваныя ў публікацыях 19 стагоддзя, падсілкоўваюць ідэі сучаснага беларускага нацыяналізму.

У канцы 19 стагоддзя паступовае ўзнікненне ідэй сучаснага беларускага нацыяналізму першапачаткова адбывалася ў форме літаратурнага фенамену, які паўстаў сярод двухмоўнай беларуска-польскай і беларуска-рускай інтэлігенцыі пад уплывам рамантызму. Яно было гістарычна натхнёна перыядамі Полацкага княства і Вялікага Княства Літоўскага. З тых часоў нацыяналістычны рух часта быў звязаны з адраджэннем і аднаўленнем беларускай мовы як сродка мастацкага выяўлення.

Пытанне ідэнтычнасці, вельмі важнае сёння ў Беларусі, было важным для нацыянальнага руху і ў 19 стагоддзі, і на пачатку 20 стагоддзя. Дэфармаванае дэмаграфічнае становішча прывяло да сітуацыі, калі меньш за 3% беларусаў былі жыхарамі гарадоў. Астатнія 97% пражывалі ў сельскай мясцовасці і ідэнтыфікавалі сябе па рэлігіі і па іх месцы жыхарства, а не па нацыянальнасці. Невялікая колькасць урбанізаваных былі пераважна русіфікаваны або паланізаваны. Жыхары буйных гарадскіх цэнтраў – плавільных горанаў, дзе развіваўся нацыянальны рух у іншых еўрапейскіх краінах – былі ў асноўным заселены габрэямі (у выніку ўказа Кацярыны Вялікай аб «межах аседласці» і забароны Аляксандрам III у 1883 годзе пасялення габрэяў у сельскай мясцовасці).

Масавая эміграцыя ў канцы 19 стагоддзя і на пачатку 20 стагоддзя таксама адыгрывла пэўную ролю ў пытанні ідэнтычнасці. Каля паўмільёна чалавек пакінула беларускія тэрыторыі і рушыла ў Злучаныя Штаты, Бразілію, Аргенціну і Канаду ў асноўным па эканамічных прычынах, таксама ў канцы 19 стагоддзя адбывалася масавая міграцыя сялян у Расію на пошукі працы. Нягледзячы на тое, што дыяспара была велізарная, замест далучэння да яе, альбо фармавання арганізацый беларускай дыяспары, эмігранты, як правіла, далучаліся да польскіх ці рускіх дыяспар, аслабляючы тым самым любыя рэальныя ўяўленні пра беларускую нацыянальную ідэнтычнасць за мяжой.

20 стагоддзе пачалося для Беларусі з велізарных пакут у Першай сусветнай вайне, а потым пачалася рэвалюцыя і спроба стварэння незалежнай Беларускай Дэмакратычнай Рэспублікі, якая была абвешчана ў 1918 годзе, але ў наступным годзе стала Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай. Гэта часткова абумовіла руска-польскую вайну 1919-1920 гадоў, у якой тэрыторыя Беларусі з'яўлялася асноўнай прычынай спрэчак, і якая скончылася падзелам яе тэрыторыі паводле Рыжскага дагавора 1921 года. Паводле гэтага дагавора заходнія беларускія землі адышлі да Польшчы, цэнтральная частка засталася намінальна як незалежная Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, а яе ўсходнія тэрыторыі ўвайшлі ў склад Расійскай Федэрацыі, і былі вернуты толькі ў 1924 і 1926 гг.

У 1920-х гадах пры савецкай уладзе праводзілася палітыка «карэнізацыі», пры якой падтрымлівалася «беларусізацыя» і была створана роўнасць правоў чатырох асноўных моў - беларускай, польскай, рускай і ідышу. З 1922 па 1926 год большасць пачатковых школ перайшлі на выкарыстанне беларускай мовы ў якасці мовы навучання, яе нават пачалі ўводзіць у вышэйшых навучальных установах. Вяртанне этнічных беларускіх тэрыторый з Расійскай Федэрацыі ў Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку ў 1924 і 1926 гадах было вельмі значным і павялічыла насельніцтва з 1,5 мільёна амаль да 5 мільёнаў.

Тым часам у Польшчы заходнія беларусы мелі больш за 400 беларускіх пачатковых школ, а таксама дзейнічалі некаторыя іншыя навучальныя установы. Аднак, ужо ў 1924 годзе сітуацыя змянілася. Школы былі зачынены, існавалі жорсткія абмежаванні на выдавецкую дзейнасць, дэ-факта ажыццяўлялася палітыка каланізацыі беларускіх этнічных тэрыторый польскімі фермерамі, праводзіліся і іншыя меры для паланізацыі і акаталічвання «Заходняй Беларусі».

Як і на Украіне, культурны росквіт у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы скончыўся ў 1928 годзе ў сувязі з правядзеннем Масквой новай палітыкі, якая стала прычынай канца «беларусізацыі», прывяла да перапісвання гісторыі і масавых арыштаў, расстрэлаў і дэпартацый каля двух мільёнаў чалавек.

У 1939 годзе савецкія войскі ўступілі на тэрыторыю Польшчы, адбылася анэксія «заходняй Беларусі» і «заходняй Украіны» у адпаведныя савецкія рэспублікі. Неўзабаве пасля анексіі «заходняй Беларусі» Савецкі ўрад перадаў Віленскую вобласць Літве. Таксама гэта быў перыяд масавых арыштаў і дэпартацый. Затым пачаўся перыяд нямецкай акупацыі беларускіх зямель - з 1941 па 1944 год - у які, паводле ацэнак, загінула 2,2 мільёна чалавек.

Як і на Украіне, немцы дапускалі тут некаторыя праявы нацыяналізму, асабліва супрацьлеглыя савецкаму бальшавізму. З вяртаннем савецкай улады пачаліся ўцёкі на захад, пакаранні, арышты і дэпартацыі ў Сібір да ў іншыя месцы. У выніку другой сусветнай вайны Беларусь была спустошана па ўсіх паказчыках.

Падчас халоднай вайны па прычыне свайго геаграфічнага становішча Беларусь была самай мілітарызаванай рэспублікай у Савецкім Саюзе. На ключавыя пасады ў Мінску/Менску, а таксама ў гарадах, размешчаных на заходняй мяжы, - Гародні і Брэсце - прызначаліся пераважна этнічныя рускія эмігранты. У гэты перыяд адбывалася вельмі актыўная русіфікацыя, з пачатку 1950-х гадоў беларускую мову неафіцыйна забаранілі, мелі месца і іншыя «культурныя чысткі». Нягледзячы на тое, што існавала некаторая дысідэнцкая апазіцыя, супраціўленне русіфікацыі было слабое. Руская мова стала мовай прэстыжных пасад, адукацыі, урбанізацыі і мадэрнізацыі, у той час як савецкая прапаганда вылучала беларусаў як «самую савецкую» з усіх нацыянальнасцяў у СССР.

Такім чынам, Беларусь існавала ў культурным асяроддзі, дзе праяўленне нацыянальнай ідэнтычнасці жорстка спынялася, «родная мова» прыгняталася, не мела ніякага ўплыву, а нацыянальная гісторыя была невядома большасці людзей. Акрамя таго, яе народ падвергся спусташэнню і знясіленню ў выніку двух сусветных войнаў, інспіраваных Масквой і Берлінам, а таксама ідэалагічнай, рэлігійнай і анэксійнай прапагандай, якая ажыццяўлялася на працягу стагоддзяў Варшавай і Масквой. У гэтым кантэксце нядзіўна, што беларусы ўдзячны таму, што яны маюць сваю тэрытарыяльную адзінку, з якой яны атаясамляюць сябе, і права на членства ў ААН. Яны не бачаць сябе па-за межамі савецкага кантэксту. Яны былі рэспублікай, дзе ў выніку сур'ёзнага спусташэння і неверагодных чалавечых пакут, камуністычны эксперымент быў найбольш паспяховым, хоць адбываўся ён за кошт духоўнага вымірання беларускага народа і цяжкіх культурных страт.

На гэтым фоне катастрофа на Чарнобыльскай АЭС у 1986 годзе, як і на Украіне, мела эффект запаволенага выгарання - доўгатэрміновы фундаментальны ўплыў на свядомасць беларусаў. Таксама і як масавыя пахаванні, выяўленыя ва ўрочышчы пад Мінскам/Менскам, дзе пахаваны больш за чвэрць мільёна няўлічаных раней цывільных ахвяраў сталінскіх рэпрэсій. У той час як гісторыя рухалася ў адным накірунку, беларусы, навучаныя вопытам асцерагацца гісторыі і зменаў, кансерватыўна адмовіліся рухацца наперад. На рэферэндуме ў сакавіку 1991 года 82% беларусаў прагаласавалі за захаванне Савецкага Саюза як адзінай дзяржавы.

Змены, аднак, прыйшлі. У верасні 1991 года парламент перайменаваў Савецкую Рэспубліку ў Рэспубліку Беларусь, былі прынятыя новы нацыянальны сцяг і герб (але яны змяніліся праз некаторы час пры кіраванні прэзідэнта Лукашэнкі). У снежні 1991 года, па іроніі лёсу, у Беларусі, у Белавежскай пушчы на сустрэчы лідэраў Беларусі, Расіі і Украіны быў аб'яўлены распад СССР і заменены на Садружнасць Незалежных Дзяржаў. Пазней Беларусь прыняла Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце, у якой яна выбрала нейтралітэт, і разам з Украінай і Казахстанам дэмантавала ядзерны арсенал, які быў размешчаны на яе тэрыторыі і ўключаў больш за

восемдзесят міжкантынентальных балістычных ракет, прычым ядзерныя боегалоўкі былі перададзены ў Расійскую Федэрацыю. Гэтае рашэнне пашырыла магчымасці Беларусі для міжнародных кантактаў.

Пачатак 1990-х гадоў быў цяжкім перыядам для краіны. Захавалася савецкая наменклатура і стары палітычны рэжым, і было лягчэй ісці назад да вядомага, чым рухацца наперад да невядомага. Такім чынам, нейтралітэт змяняецца планамі далучыцца да новых расійскіх мер бяспекі, увесці расійскі рубель у якасці законнага плацёжнага сродку і гэтак далей. Апазіцыя была пазбаўлена палітычнага ўплыву. Сацыяльна-эканамічны крызіс, які адчуваўся, звязваліз распадам СССР. У 1994 годзе, у супрацьлегласць парламенцкай рэспубліцы, была створана прэзідэнцкая рэспубліка і ў выбарах, якія адбыліся ўслед за гэтым, нечаканую і моцную перамогу сярод чатырох кандыдатаў атрымаў Аляксандр Лукашэнка, кіраўнік антыкарупцыйнага камітэта.

Абапіраючыся на далейшыя канстытуцыйныя змены, накіраваныя на павелічэнне паўнамоцтваў прэзідэнта пры падтрымцы пенсіянераў (каля чвэрці насельніцтва), людзей, якія жывуць у сельскай мясцовасці, большасці рускіх і значнай долі працоўнага класса, прэзідэнт Лукашэнка ўзмацніў свае пазіцыі. Падрабязная справаздача аб эксцэнтрычным праўленні Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта выходзіць за рамкі гэтых уводзінаў. Істотныя элементы яго кіравання ўключылі: гарантаванне рускай мове роўнага статусу з беларускай мовай, замену дзяржаўнай сімволікі незалежнай Беларусі на старую савецкую з вельмі нязначнымі карэкціроўкамі, хісткасць адносін з Расіяй і раптоўныя змены ў праекце Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Захаванне за сабой пасады прэзідэнта і выкарыстанне смяротнага пакарання, рэпрэсіўны і недэмакратычны стыль кіравання ізалявалі Беларусь ад больш шырокага супрацоўніцтва з Еўропай, напрыклад, у рамках Савета Еўропы, з прамымі і ўскоснымі наступствамі для культуры.

Непрадказальнае праўленне прэзідэнта Лукашэнкі таксама выклікала супярэчнасці рознага кшталту, спрыяла ізаляцыі краіны, успрыняццю яе Еўразвязам як «апошняй дыктатуры ў Еўропе». З другога боку, напрыклад, суровы імідж і сумная савецкая правінцыйная рэальнасць Мінска/Менска да абвяшчэння незалежнасці саступілі месца не толькі сацыяльна-квітнеючай сталіцы («капучына камунізму»), але і цікавы цэнтр узнікнення руху адукаваных і маладых людзей, якія пачынаюць разумець сваё гістарычнае мінулае, знаходзіць сваю беларускую ідэнтычнасць і імкнуцца да ўзаемадзеяння з Еўропай, у цэнтры якой іх краіна геаграфічна размешчана.